КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 10 (233) ◂ 11 сакавіка ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**ГЛЕБА ДЛЯ КАРУПЦЫІ**

Стар. 4

**НАСТАЎНІК, ХТО ТЫ?**

Школьнае нявольніцтва ці сумленная грамадзянская пазіцыя? Гэта пытанне і ўздымае ветэран педагагічнай працы

Стар. 6

**ПРЫГОДЫ БАРОНЫ ГУТЭНБЕРГА**

Афера міністра абароны Карла Тэадора Гутэнберга здольная запусціць працэс змены ўлады ў Берліне

Стар. 13

**МІКАЛАЙ АРЭХВА**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ДЫЯЛОГ**

Артыкул Сяргея Нікалюка з цыклу «Азбука паліталогіі»

▸ АД РЭДАКТАРА

# АД СУМЫ ДЫ АД ТУРМЫ…

Аляксей КАРОЛЬ

**Гэта старадаўняя прымаўка ўзнікла ў несвабодных, аўтакратычных грамадствах. Дзе воля вярхоўнага ўладара вышэй за закон, а закон што дышла ў руках уладнай вертыкалі. Дзе судовая сістэма — элемент карнага механізму, інструмент расправы з нязгоднымі і іншадумцамі і дзе выпадковай ахвярай можа стаць кожны.**




І не важна, якое стагоддзе на двары і якая пануе вертыкаль — княжацкая, ханская, імператарская ці прэзідэнцкая. Самая жорсткая — вертыкаль таталітарнага гатунку.

Судовыя працэсы, якія распачаліся ў Беларусі па так званай «справе аб масавых беспарадках 19 снежня», — таму яшчэ адно змрочнае пацвярджэнне. Гэтую справу дзеючы кіраўнік дзяржавы А. Лукашэнка кваліфікаваў як спробу дзяржаўнага перавароту. Серыя публікацый «*За кулисами одного заговора. Некоторые рассекреченные документы о событиях 19 декабря*» ў газеце «СБ. Беларусь сегодня» напрыканцы студзеня 2011 года падвяла пад гэты вердыкт нібыта дакументальную, нібыта доказную базу. Безапеляцыйна абвінаваўчую. Яшчэ да суда. Такім чынам, па-сутнасці суды атрымалі рамачныя ўмовы, сваіх паводзін і сваіх прысудаў па гэтых справах. Ніякага свавольства.

Першыя судовыя працэсы не пакінулі сумненняў: устаноўкі выконваюцца з непахіснай цвёрдасцю і бездакорнасцю. Васіль Парфянкоў стаў першым з 42 абвінавачаных па справе «аб масавых беспарадках 19 снежня». Вырак суда Фрунзенскага раёна — 4 гады калоніі ўзмоцненага рэжыму. Той жа суд па другім працэсе прыгаварыў Аляксандра Атрошчанкава да 4 гадоў зняволення, Змітра Новіка — да 3,5, Аляксандра Малчанава — да 3. У судзе Маскоўскага раёна працягваецца працэс над грамадзянамі Расіі Іванам Гапонавым і Арцёмам Брэусам. Тамсама пачаўся разгляд справы прадпрымальніка Дзмітрыя Мядзведзя, працяг — 10 сакавіка.

Падгонка фактаў, пры іх фальсіфікацыі, пад загатаваныя прысуды. Па гэтай жалезнай схеме вядзецца следства і па ёй жа працуе суд. Царыца доказаў — паказанні абвінавачаных. Як, праз якія псіхалагічныя і фізічныя катаванні дамагаюцца прызнанняў, распавёў Алесь Міхалевіч.

Перакінута яшчэ адна дуга пераемнасці з 2000-х гадоў да 1930-х. Раней у найноўшай беларускай канструкцыі аўтарытарызму не хапала гэтага злавеснага элементу — паказальных судоў з кляймом «за спробу дзяржаўнага перавароту». Цяпер ён ёсць. Хаця і з пэўнымі адрозненнямі. Па колькасці абвінавачаных — 42 чалавекі — можна было чакаць арганізацыі аднаго маштабнага паказальнага судовага працэсу. Аднак улады на гэты эксперымент не адважыліся. Сотні людзей разам — небяспечная маса. Працэс раздрабілі на асобныя звёны па розных судах. Падобна на тое, што на фінішны этап прыгатаваны справы тых, каму пастаноўшчыкі адвялі ролю арганізатараў, — былым кандыдатам на пасаду прэзідэнта з іх бліжэйшымі паплечнікамі. На грунце, так бы мовіць, ужо адбыўшыхся прызнанняў і прысудаў.

Не адважыліся аўтары справы аб «масавых беспарадках» і на арганізацыю сходаў і мітынгаў працоўных калектываў — на заводах, фабрыках, установах (тым больш на плошчах), якія б аднадушна бэсцілі «ворагаў народа», патрабавалі для іх суровага пакарання і ўхвалялі прысуды. А вось маштаб, змест, формы і метады афіцыйнай прапаганды ў доказ віны падсудных — вельмі падобныя.

Яшчэ адзін пракляты знак падабенства на дузе пераемнасці — пакаянні падсудных. Яраслаў Раманчук, які, не падымаючы вачэй ад паперкі, зачытвае не ім напісаны тэкст. Андрэй Дзмітрыеў, які запаволена, збіваючыся, прамаўляе нешта апраўдальнае наконт міліцыі. Шэраг іншых пакаянняў маладых людзей, што прагучалі ў прапагандысцкім «кінашэдэўры» «Железом по стеклу». Аднак ўстрымаемся ад папрокаў. Як не папракаем мы ахвяр (яны ж і героі) сталінскіх часоў за іх пакаянныя лісты і артыкулы. Тых жа Чарвякова, Жылуновіча, Ігнатоўскага. Узгадваюцца і словы Эрнэста Хемінгуэя: жыццё ламае кожнага — і моцнага, і слабага. І многія робяцца толькі мацнейшымі на зломе.

Ведаць і рабіць высновы для сябе з тых трагічных старонак жыцця сваіх палітычных папярэднікаў не тое што варта — неабходна. Бо мэты творцаў рэжымаў аднаасобнай улады на абодвух канцах таталітарнай дугі — аднолькавыя: раз'яднаць на варагуючыя групоўкі, раздрабіць, перасварыць, звесці на нішто апазіцыю сабе любімым. Пры ўсёй непрыязнасці нацыянальных дэмакратаў Усевалада Ігнатоўскага і Зміцера Жылуновіча адзін да аднаго, ніхто з іх на допытах не агаварыў другога. Наадварот, выводзілі з-пад udараў, як маглі.

Варта было б пра гэта ўспомніць Рыгору Кастусёву, калі ён, нібыта выкрываючы інтрыгі супраць сябе і сваёй партыі з боку сваіх нібыта апанентаў унутры апазіцыі, паралельна нібыта аб'ектыўна пахвальваў КДБ за карэктныя адносіны да сябе. Свядома ці не свядома, але тым самым ён спрацоўвае на ўладную канцэпцыю судовага працэсу, падкідвае хворасту ў касцёр пад нагамі падсудных. Не выключана, што і пад сваімі таксама.

Судовыя працэсы, што зараз набіраюць разгон, — зразумела, працяг рэпрэсіўнай хвалі, узнятай рэжымам 19 снежня. Але каб не было Плошчы, падаецца, што ўлады ўсё роўна, раней ці пазней, сарваліся б у рэпрэсіўны віраж на нейкай іншай падзеі. Бо рэпрэсіі і маштабныя судовыя расправы — у логіцы таталітарных сістэм, гэта абавязковы элемент іх існавання, метад кансалідацыі кіроўнай эліты і запалохвання грамадства. Але ні адну з іх гэтыя працэсы не ўратавалі ад краху.

ІНІЦЫЯТЫВА

# ВОЛЧАК ІДЗЕ Ў КДБ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**На 16 сакавіка праваабаронцу Алегу Волчаку прызначылі сустрэчу ў КДБ. Размова адбудзецца з начальнікам УКДБ па Мінску і Мінскай вобласці Уладзімірам Калачам.**

Алег Волчак дамогся сустрэчы з Калачам па ўласнай ініцыятыве. І мае намер патрабаваць вяртання кампутара і дыскаў, забраных у яго 25 снежня падчасператрусу.

Першая спроба патрапіць на прыём была пры наведванні ўпраўлення КДБ 2 сакавіка. Аднак дзяжурны паведаміў, што начальнік яшчэ не прыйшоў з адпачынку. Алег Волчак патлумачыў камітэтчыкам, што калі не вернуць яго маёмасць, то ён падасць заяўку ў гарвыканкам на пікетаванне КДБ, каб «пачаць змагацца за свае правы». І будзе ўздымаць гэта пытанне «на міжнародным узроўні». «Праз паўгадзіны мне патэлефанавалі і сказалі, што 16 сакавіка ў мяне будзе сустрэча з начальнікам», — кажа праваабаронца.

Хадайніцтва аб вяртанні тэхнікі ён накіраваў напрыканцы лютага старшаму следчаму УКДБ Андрэю Дарашэвічу, які праводзіў ператрус. Алег Волчак указаў, што забіраць кампутар не было падстаў. Яго вынялі з тлумачэннем, што там можа быць інфармацыя, датычная крымінальнай справы аб «масавых беспарадках» 19 снежня.

Праваабаронца заявіў, што такой інфармацыі ў кампутары няма. «А каб даказаць гэта, я прапанаваў агледзець яго ў маёй прысутнасці», — нагадаў ён следчаму.

У кампутары і на старых дысках была інфармацыя аб праваабарончай дзейнасці, уласныя артыкулы, фота-, відэа- і іншая інфармацыя, якая збіралася працяглы час. Як зазначыў Волчак, на кампутары працавала яго жонка і вучылася дзіця. Згодна з артыкулам 13 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса, кожны грамадзянін мае права на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё. У тым ліку ад замаху на тайну карэспандэнцыі і іншых паведамленняў. «Там захоўваецца асабістая інфармацыя — мая і маіх кліентаў», — падкрэсліў праваабаронца.

«Ствараецца ўражанне, што вобшук і выняцце кампутара і іншых носьбітаў інфармацыі было падставай атрымаць дадзеныя аб маёй асабістай і прафесійнай дзейнасці», — рэзюмаваў у хадайніцтве Волчак.

За два месяцы, паводле яго словаў, маглі ўжо тысячу разоў «праверыць» усе гэтыя дакументы. Па «справе 19 снежня» кампутары і іншую аргтэхніку з носьбітамі інфармацыі масава канфіскавалі ў актывістаў, праваабаронцаў, журналістаў. І ніхто не ведае, што з імі адбываецца, ці будуць яны аддадзены, і ў якім стане.

Алег Волчак заклікае пацярпелых грамадзян таксама звяртацца ў КДБ і патрабаваць вярнуць сваю маёмасць.

ПРЭМІЯ

# АПЛАДЫСМЕНТЫ НАСЦЕ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Прэміяй за мужнасць сярод дзесяці жанчын з розных краін свету ўганаравана 20-гадовая Наста Палажанка. Упершыню лаўрэатам прэстыжнай міжнароднай узнагароды стала беларуска.**

Цырымонія ўручэння прэмій адбылася 8 сакавіка ў Вашынгтоне. Намесніца старшыні «Маладога фронту» Наста Палажанка не змагла на ёй прысутнічаць. Бо вызваленая пад падпіску аб нявыездзе з СІЗА КДБ, дзе правяла два месяцы. Дзяўчына з'яўляецца абвінавачанай па «справе 19 снежня».

Дзяржсакратар ЗША Хілары Клінтан сказала пра немагчымасць Насты прыехаць на цырымонію, гэтаксама як і Ёані Санчэз з Кубы. «Наста Палажанка з Беларусі жыве ў такія цяжкія часы, — сказала спадарыня Клінтан. — У краіне ў Еўропе, якая па-ранейшаму прыгнятае свой народ, фальсіфікуе выбары, зняволвае палітычных апанентаў самымі жорсткімі і брутальнымі спосабамі. Але яна паўстала і выказалася».

Хілары Клінтан адзначыла, што дзяўчына поўная рашучасці ў развіцці грамадзянскай супольнасці і палітычнай актыўнасці моладзі. І, «кідаючы выклік, яна смела дапамагае намецішь шляхі да мірнага дэмакратычнага грамадства». «Мы апладзіруем ёй!» — заявіла дзяржсакратар.

Прэмію за мужнасць, якая мае 4-гадовую гісторыю, Дзяржздэпартамент ЗША прысуджае штогод 10 жанчынам розных узростаў і нацыянальнасцяў. Але ўсім ім уласціва адна якасць — выбітная мужнасць.

«Для мяне гэтая прэмія — найперш удзячнасць усім тым людзям, якія выйшлі 19 снежня на плошчу», — сказала ў інтэрв'ю Радыё «Свабода» Наста Палажанка. І, як адзначыла яна, гэта ганар за яе сяброў-маладафронтаўцаў. За Зміцера Дашкевіча, Уладзіміра Яроменку, Алеся Кіркевіча, Эдуарда Лобава, а таксама за былога кіраўніка «Маладога фронту» Паўла Севярынца.

«За ўсіх, хто яшчэ застаецца за кратамі. І, безумоўна, калі гэта прэмія прысуджаецца жанчынам, я не магу не адзначыць мужных Ірыну Халіп і Наталлю Радзіну, з якімі я была ў турме разам. Таму гэтая прэмія — наша агульная, я не лічу яе персанальна маёй прэміяй», — заявіла Наста.

ПАМЯЦЬ

# ДВА ГАДЫ БЕЗ ЯНЫ

Таццяна ШЭЛЕГ

**7 сакавіка споўнілася два гады, як не стала праваабаронцы Яны Паляковай. У Салігорску гэтым днём да яе магілы ўсклалі кветкі калегі і паплечнікі.**

З-за сваёй грамадскай дзейнасці Яна Палякова была даведзена да самагубства. «І, натуральна, кожны год мы будзем яе ўзгадваць. Як мы ўзгадваем і прапаўшых палітыкаў у дзень іх знікнення. Таксама будзем і пра Яну памятаць», — сказаў праваабаронца Алег Волчак.

Яну збівалі ў міліцыі, прымушаючы адмовіцца ад подпісаў, якія яна збірала за вылучэнне ў кандыдаты ў дэпутаты парламента Вольгі Казулінай. Яе білі і ў пад'ездзе дома са словамі: «Сука, калі сунімешся?! Гэта апошняе папярэджанне». Званілі ноччу і пагражалі расправай. «І званкі гэтыя «прабілі» — яны былі з РАУС Салігорскага раёна», — паведаміў Алег Волчак.

3 сакавіка 2009 года Салігорскі раённы суд прызнаў Яну вінаватай у заведама ілжывым даносе на міліцыянта, капітана Пугача, які нанёс ёй пабоі. І вынес прысуд — 2,5 гады абмежавання волі (так званай «хіміі»). 6 сакавіка ў «Советской Белоруссии» рэдактар Павел Якубовіч апублікаваў пасквіль, у якім абліў брудам жанчыну. А ўначы яе не стала. За паўтары месяцы за гэтага Яне споўнілася 33 гады.

«Фактаў было дастаткова, што чалавек не сам сышоў з жыцця, а яго падштурхнулі», — адзначыў Алег Волчак. Але пракуратура Салігорскага раёна адмовілася ўзбудзіць крымінальную справу — давядзенне да самагубства.

У Салігорску, як кажуць калегі, Яну ведалі перш за ўсё як душэўнага чалавека. Яна не проста як юрыст дапамагала, але і як псіхолаг. «Таму яе добра помняць. І ўсе без тлумачэння разумеюць, што гэта не простае самагубства. А ўладай даведзенае. Я перачытаў яе старыя артыкулы. Яна як звон была ў Салігорску. Званіла, дзе бяспраўе. Яна абараняла ўсіх: і апазіцыянераў, і не апазіцыянераў», — кажа Алег Волчак.

Яна Палякова застанецца ў памяці людзей сваімі справамі. «Такія людзі будуць з намі жыць, будуць нашымі анёламі-ахоўнікамі. І, канечне, гэта трэба памятаць. Вось што зараз самае галоўнае. Не дай Бог, каб больш у нас такое адбывалася», — зазначыў Алег Волчак.

Праваабаронцы, сярод якіх і былая палітвязень Кацярына Садоўская, наведалі ў Салігорску і маці Яны Паляковай.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# НАЗІРАЛЬНІКА ДЭПАРТАВАЛІ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Памочніка прадстаўніка Міжнароднай назіральнай місіі Максіма Кіцюка затрымалі на беларускай мяжы. Са штампам аб дэпартацыі на квітку яго адправілі назад ва Украіну.**

Максіма Кіцюка, украінскага грамадзяніна, беларускія памежнікі знялі з цягніка Кіеў — Мінск ноччу 9 сакавіка. Пры праверцы дакументаў высветлілася, што яго прозвішча лічыцца ў базе дадзеных памежнай службы з паметкай «Уезд забаронены».

Памежнікі накіравалі запыт у Мінск, інфармацыя аб «статусе» Максіма Кіцюка пацвердзілася. «Аднак на якой падставе яго імя апынулася ў дадзеным спісе, ніхто з супрацоўнікаў памежнай службы растлумачыць не мог», — паведамляе Міжнародная назіральная місія.

Максім правёў ноч у камеры, у якой знаходзілася толькі прыкручаны да падлогі табурэт. Супрацоўнікі памежнага атрада забралі ў яго мабільныя тэлефоны. І не рэагавалі на звароты аб неабходнасці звязацца з амбасадай Украіны ў Беларусі. Быў праведзены асабісты дагляд Максіма і дагляд рэчаў. Раніцай яго адправілі ва Украіну да станцыі Гарнастаеўка.

Як адзначылі міжнародныя назіральнікі, раней Максім Кіцюк неаднаразова прыязджаў у Беларусь у якасці памочніка назіральніка місіі. І гэтым разам ехаў у Мінск з мэтай ажыццяўлення праваабарончай дзейнасці. А менавіта для маніторынгу «выканання Беларуссю сваіх асноўных міжнародных абавязацельстваў у сферы забеспячэння фундаментальных правоў і свабодаў чалавека».

«Пры гэтым Беларусь, як краіна-ўдзельніца АБСЕ, павінна садзейнічаць кантролю, у тым ліку і праваабарончаму, за выкананнем гэтых абавязацельстваў», — падкрэсліла ў сваім паведамленні Міжнародная назіральная місія.

Нагадаем, што місія была накіравана ў Беларусь Камітэтам міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі. Ён быў створаны кааліцыяй з больш чым 30 няўрадавых арганізацый краін АБСЕ 27 снежня 2010 года.

Місія аператыўна рэагавала на апошнія падзеі ў Беларусі. У прыватнасці, паведамляла ў міжнародныя структуры пра масавыя вобшукі, перáслед беларускіх праваабаронцаў і журналістаў, перашкоды ў доступе адвакатаў да палітзняволеных, ціск на адвакатаў. А таксама заявіла аб намеры правесці маніторынг судовых працэсаў па крымінальнай справе па падзеях 19 снежня.

КАНФЕРЭНЦЫЯ

# ДЭМАКРАТЫ — ЗА БАЙКОТ

Барыс ВЫРВІЧ

**5 сакавіка ў Магілёве ў грамадскім цэнтры «Кола» прайшла канферэнцыя дэмакратычных сіл Магілёўскай вобласці.**

Удзел у ёй прынялі больш за сорак дэлегатаў, якія прадстаўлялі асноўныя апазіцыйныя палітычныя і грамадскія арганізацыі Магілёўскай вобласці, а таксама прадстаўнікі рэгіянальных кааліцый дэмакратычных сіл.

На канферэнцыі былі падведзены вынікі ўдзелу ў кампаніі прэзідэнцкіх выбараў 2010 года, абмеркаваны вопыт узаемадзеяння розных партый і арганізацый вобласці падчас выбарчай кампаніі. Таксама магілёўскія актывісты падзяліліся сваімі меркаваннямі наконт сучаснай грамадска-палітычнай сітуацыі ў вобласці і краіне, вызначылі накірункі дзейнасці дэмакратычных сіл вобласці на бліжэйшы час.

Дэлегаты канферэнцыі большасцю галасоў выказаліся за актыўны байкот маючых адбыцца ў 2012 годзе парламенцкіх выбараў. Магілёўскія дэмакраты лічаць, што няма ніякага сэнсу прымаць удзел у так званых «выбарах», пакуль у краіне ёсць палітвязні і няма дэмакратычных зменаў у існуючым выбарчым заканадаўстве.

«Пакуль у турмах і пад следствам знаходзяцца кандыдаты ў прэзідэнты і дэмакратычныя актывісты, мы не маем маральнага права ўдзельнічаць у любых выбарчых кампаніях», — выказаў сваё меркаванне старшыня рады Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сіл Юрый Новікаў.

Па выніках працы канферэнцыі была прынятая рэзалюцыя, у якой удзельнікі канферэнцыі звярнуліся да жыхароў Магілёўскай вобласці з прапановай далучыцца да працы па пабудове свабоднай, дэмакратычнай і квітнеючай Беларусі.

ЛІСТ

# Я ГАНАРУСЯ ЖАНЧЫНАМІ!

«Моцы духа і трываласці! Веры і надзеі!» Гэтага пажадаў жанчынам і ўсім чытачам «Новага часу» палітвязень Мікалай Аўтуховіч.

У рэдакцыі газеты атрымалі ад палітзняволенага паштоўку «Са святам вясны». «Шчыра жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця і кахання, добрага настрою і ўсмешак!» — павіншаваў ён прыгожых палавінак рэдакцыі з 8 сакавіка. І зазначыў: «Я ганаруся нашымі Беларускімі Жанчынамі!»

**P.S.** Нагадаем, лісты палітвязню можна дасылаць на адрас:

225293, г. Івацэвічы–3, Папраўчая ўстанова «Папраўчая калонія № 5», Атрад № 13, Брэсцкая вобласць

Аўтуховічу Мікалаю Мікалаевічу

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# РАЗБОРКІ. ПРАЦЯГ – 2

Сяргей САЛАЎЁЎ

**На носе ў Беларусі парламенцкія выбары. Відавочна, яны могуць прайсці з тым жа «гламурам», як і мінулыя прэзідэнцкія. З адноснай вольніцай у агітацыі, у рэгістрацыі прэтэндэнтаў на пасаду дэпутата Палаты прадстаўнікоў, з выкарыстаннем хай і абмежаванага, але права на радыё і тэлеэфір. Але беларуская апазіцыя, замест таго, каб прааналізаваць вынікі прэзідэнцкай кампаніі, пазначыць свае слабыя і моцныя бакі, працягвае займацца самаедствам. Нават не самаедствам — пажыраннем адзін аднаго.**



На гэтым тыдні палена ў вогнішча падкінуў былы кандыдат на пасаду прэзідэнта ад Партыі БНФ Рыгор Кастусёў.



Рыгор Кастусёў

6 сакавіка на з'ездзе Гомельскай абласной арганізацыі Партыі БНФ Кастусёў заявіў, што ў перыяд выбараў яго спрабавалі зняславіць, публікавалі на яго «пасквілі», прычым не ўладныя структуры. «У «Народнай волі» ў адным толькі нумары былі два такія артыкулы на мой адрас. Мы з Аляксеем Янукевічам былі ў Сярэдзіча, размаўлялі з ім, але Сярэдзіч сказаў у адкрытую, што давайце грошы — і мы апублікуем артыкул, які вы замовіце. Гэта што — нармальна?» — сказаў Кастусёў.

Апроч таго, Кастусёў заявіў, што ад аднаго з кандыдатаў у прэзідэнты яму паступіла прапанова зняць кандыдатуру за пэўную плату — 100 тысяч долараў. «Гэта прапанова мне паступіла, калі з тым кандыдатам мы былі сам-насам у лесе. Але цікава, што супрацоўнікі КДБ пасля майго затрымання ў гутарцы са мной гаварылі менавіта пра такую лічбу, і сказалі, што, маўляў, мы цябе паважаем, што ты не ўзяў гэтыя грошы. Гэту «павагу» я не стаўлю сабе ў заслугу ад такой структуры. Я вам даю факты, а ацэнку гэтаму дадзім разам», — падкрэсліў Кастусёў.

Кастусёў наўпрост заявіў, што ў перыяд збору подпісаў і агітацыі ў яго адрас ад лідараў апазіцыі прыходзілі звароты з угаворамі аб зняцці, з подкупам і шантажам. «Апошняя прапанова была такая, што, маўляў, ты здымай сваю кандыдатуру, а на наступным з'ездзе БНФ мы цябе вылучым на пасаду старшыні і падтрымаем сваёй групай, каб цябе абралі. Размова была якраз напярэдадні рэгістрацыі кандыдатаў у прэзідэнты», — сказаў Кастусёў.

Гэтыя заявы выклікалі шмат абурэнняў у тых, каго Кастусёў звінаваціў. «Мы ніколі не прапаноўвалі Кастусёву зняць сваю кандыдатуру на прэзідэнцкіх выбарах у абмен на падтрымку пры выбарах старшыні Партыі БНФ», — заявіў былы старшыня партыі Вінцук Вячорка. А галоўны рэдактар «Народнай волі» Іосіф Сярэдзіч заявіў: «Да апошняга часу гісторыя Шклова (Кастусёў жыве ў гэтым райцэнтры) ведала Ілжэдзмітрыя. Цяпер вось з'явіўся яшчэ лжэц Кастусёў. Ні пра якія грошы я з ім наогул не размаўляў, як ніколі не размаўляў на гэтую тэму і з іншымі кандыдатамі ў прэзідэнты. За паклёп, за хлусню абавязкова пацягну Кастусёва ў суд. І ён ніколі больш не з'явіцца на парозе рэдакцыі».

Пры ўсёй павазе да спадара Кастусёва, ягоныя звесткі выклікаюць сумнеў. Па-першае, інфармацыя пра зняцце за 100 тысяч долараў. Гэта альбо правакацыя, альбо фэнтэзі. Калі сапраўды супрацоўнікі КДБ пасля яго затрымання казалі пра такую лічбу, то гэта правакацыя. І таму не варта Кастусёву хаваць імя неназванага «кандыдата ў прэзідэнты». Краіна павінна ведаць сваіх герояў.

Па-другое, падкупляюць альбо больш моцных, альбо з большымі рэсурсамі. Прынамсі, тых, хто можа ўмацаваць кампанію «іншага неназванага кандыдата». Кампанія ж Кастусёва была не больш моцнай, чым кампаніі таго ж Саннікава, Някляева ці Раманчука. Гэта было бачна проста па пікетах і сцягах…

Па-трэцяе, пра з'езд БНФ. Каму, як не Кастусёву ведаць, што пасля выбараў у партыі намячалася «вялікая чыстка» ад тых, хто не падтрымаў Кастусёва, а працаваў на іншых кандыдатаў. Альбо ўвогуле не працаваў. Пра якую «сваю групу» ў гэткім выпадку можа ісці гаворка?

Пакуль беларуская апазіцыя сварыцца міжсобку, найбольш прынцыповыя заходнія арганізацыі спрабуюць націснуць на кіраўніцтва Беларусі з мэтай вызвалення палітвязняў. Праваабарончая арганізацыя «Міжнародная амністыя» зноў заклікала накіроўваць лісты Аляксандру Лукашэнку і генеральнаму пракурору Рыгору Васілевічу з патрабаваннем вызваліць усіх затрыманых па справе аб масавых беспарадках у Мінску 19 снежня. Адпаведны зварот 7 сакавіка быў размешчаны на сайце арганізацыі.

«Міжнародная амністыя» заклікае запатрабаваць вызвалення ўжо асуджанага Аляксандра Атрошчанкава і яшчэ 11 чалавек, якіх праваабарончая арганізацыя прызнала вязнямі сумлення; правядзення незалежнага расследавання заяў аб катаванні зняволеных у ізалятары КДБ і доступу медыцынскіх экспертаў да ўсіх затрыманых.

Арганізацыя заклікае нагадаць беларускім чыноўнікам, што краіна падпісала Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах і павінна не дапускаць катаванняў і нечалавечага абыходжання, праводзіць аператыўнае і незалежнае расследаванне заяў па адпаведных фактах.

«Міжнародная амністыя» нагадвае, што прызнала вязнямі сумлення Аляксандра Атрошчанкава, Андрэя Саннікава, Дзмітрыя Бандарэнку, Уладзіміра Някляева, Мікалая Статкевіча, Ірыну Халіп, Наталлю Радзіну, Анастасію Палажанку, Аляксандра Фядуту, Паўла Севярынца, Анатоля Лябедзьку, Алеся Міхалевіча, Уладзіміра Кобеца, Аляксандра Арастовіча і Сяргея Марцалева.

### Першыя чатыры назіральнікі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ прыбылі ў Беларусь 9 сакавіка, каб назіраць за ходам судовых пасяджэнняў па справе аб масавых беспарадках

І гэтыя спробы даюць плён. Першыя чатыры назіральнікі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ прыбылі ў Беларусь 9 сакавіка, каб назіраць за ходам судовых пасяджэнняў па справе аб масавых беспарадках. Назіральнікі змогуць прысутнічаць на працэсах Дзмітрыя Мядзведзя, а таксама расійскіх грамадзян Івана Гапонава і Арцёма Брэуса, судовы разбор у дачыненні да якіх быў адноўлены 10 сакавіка.

Эксперты БДІПЧ будуць назіраць за асноўнымі судовымі разборамі па справе аб масавых беспарадках, па выніках маніторынгу бюро апублікуе справаздачу.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АЛЯКСАНДР ХАРЫТОН



Прадстаўнік Мінюста Аляксандр Харытон, вядомы шэрагам спраў супраць грамадскіх арганізацый, што завяршыліся іх ліквідацыяй. Цяпер ён мае дачыненне і да Беларускага Хельсінкскага камітэта. 12 студзеня, пасля таго як праваабаронцы паінфармавалі спецдакладчыка ААН па пытаннях незалежнасці суддзяў і адвакатаў Габрыэлу Кнауль аб фактах ціску ўлад на адвакатаў, якія абараняюць фігурантаў крымінальнай справы аб масавых беспарадках 19 снежня, Мінюст вынес пісьмовае папярэджанне БХК «за парушэнне заканадаўства аб грамадскіх аб'яднаннях, сродках масавай інфармацыі, распаўсюджванне няпэўнай інфармацыі, што дыскрэдытуе праваахоўныя органы і органы юстыцыі рэспублікі, уласны статут арганізацыі». Аляксандр Харытон лічыць абгрунтаваным вынесенае папярэджанне Рэспубліканскаму праваабарончаму грамадскаму аб'яднанню «Беларускі Хельсінкскі камітэт» (БХК). Пра гэта ён заявіў 9 сакавіка ў Вярхоўным судзе падчас разгляду скаргі БХК на папярэджанне Мінюста.

Харытон адзначыў, што ў паведамленні спецдакладчыку ААН БХК заявіў, што 19 снежня на плошчы Незалежнасці сабраліся ад 10 да 20 тысяч чалавек, якія пратэставалі супраць «фальсіфікацыі вынікаў прэзідэнцкіх выбараў». Па меркаванні Харытона, ужо гэтым БХК парушыў заканадаўства, паколькі такога тэрміна, як «фальсіфікацыя прэзідэнцкіх выбараў», у Выбарчым кодэксе няма, а ёсць тэрмін «парушэнні падчас выбараў». Ён палічыў тэндэнцыйнымі прыведзеныя ў паведамленні лічбы. Паводле яго слоў, БХК паведамляла пра больш чым 700 затрыманых у выніку масавых беспарадкаў у Мінску 19 снежня 2010 года, пра 25 абвінавачваных ва ўдзеле ў гэтых беспарадках і пра 15 падазраваных ва ўдзеле ў іх. Аднак, як сказаў Харытон, у паведамленні не называюцца прозвішчы 700 затрыманых, 25 абвінавачваных і 15 падазраваных. Акрамя таго, не гаворыцца, у чым яны падазраюцца.

### НАДЗЕЯ СКАРДЗІНА



Беларуская біятланістка Надзея Скардзіна дапусціла адзін промах у індывідуальнай гонцы на Чэмпіянаце свету ў Ханты-Мансійску і фінішавала чацвёртай.

Дыстанцыю 15 кіламетраў яна пераадолела за 50 хвілін 10 секунд з адной штрафной хвілінай. Скардзіна на 3 хвіліны 1,7 секунды адстала ад пераможца гонкі Хелены Экхольм са Швецыі (без промахаў), на 45,9 секунды — ад немкі Ціны Бахманн, якая заняла другое месца, і на 9,6 секунды — ад бронзавага прызёра ўкраінкі Віты Семярэнкі.

Астатнія беларускія біятланісткі не ўвайшлі ў першую дзясятку: Дар'я Домрачава заняла 19-е месца, Людміла Калінчык — 56-е, Вольга Назарава — 58-е сярод 96 удзельніц.

«Мы з сяброўкамі па камандзе абмяркоўвалі надвор'е, думалі, як лепш справіцца з такімі ўмовамі. У выніку атрымалася, што мне вецер згуляў нават на руку. На першых трох агнявых рубяжах ён практычна не турбаваў, а вось на заключнай «стойцы» мяне накрыў моцны парыў. У выніку адзін са стрэлаў сышоў паблізу мішэняў. У любым выпадку, я вельмі задаволеная сваім вынікам. Гэта маё лепшае дасягненне ў кар'еры», — сказала Скардзіна.

### ЮРЫЙ БАЗАН



Аўтарадыё» выйграла суд у Мініінфармацыі — Вышэйшы гаспадарчы суд прызнаў несапраўднымі папярэджанне Міністэрства інфармацыі, вынесенае ЗАТ «Аўтарадыё», і рашэнне Рэспубліканскай камісіі па тэлебачанні і радыёвяшчанню аб спыненні вяшчання радыёстанцыі.

Суддзя Валер Шобік абавязаў міністэрства і камісію, якая функцыянуе пры ім, выплаціць ЗАТ «Аўтарадыё» ў агульнай суме 1,4 мільёна рублёў судовых выдаткаў.

Як паведаміў БелаПАН галоўны рэдактар «Аўтарадыё» Юрый Базан, пры ўдалым збегу акалічнасцяў трансляцыя радыёстанцыі можа быць адноўленая да канца наступнага тыдня. Месяц прастою радыёстанцыі Базану ніхто не кампенсаваў.

Папярэджанне было вынесенае Мінінфармам 10 студзеня, што стала адной з падстаў для спынення вяшчання радыёстанцыі 12 студзеня па рашэнні Рэспубліканскай камісіі па тэлебачанні і радыёвяшчанню.

Паводле афіцыйнай фармулёўкі, прычынай папярэджання і спынення вяшчання «Аўтарадыё» стала распаўсюджванне ў эфіры радыёстанцыі інфармацыі, «якая змяшчае публічныя заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці» — прэтэнзіі былі да фразы экс-кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава аб тым, што «лёс краіны вырашаецца не на кухні, а на плошчы».

Кандыдат лінгвістычных навук Аксана Шчарбакова правяла па запыце «Аўтарадыё» лінгвістычны аналіз і зрабіла заключэнне, што ролік «па свайму зместу і танальнасці не ўтрымлівае якіх-небудзь заклікаў і лозунгаў».

ДАРОГА

# «ВІЛКА» ПАКАРАННЯЎ — ГЛЕБА ДЛЯ КАРУПЦЫІ

**За актыўнасць і прынцыповасць Аляксандр Канапліцкі — былы старэйшы следчы па асабліва важных справах следчага камітэта МУС аддзела дарожна-транспартных здарэнняў па гораду Мінску — займеў шырокую вядомасць у вузкіх колах. Супрацоўнікі дзяржаўтаінспекцыі атрымалі нелегальную каманду не запрашаць да ўдзелу ні ў якіх грамадскіх дыскусіях. «Але ўжо сфарміравалася кола аднадумцаў, ёсць сайт www.stop-gai.by, на якім змешчана мноства матэрыялаў на дарожна-транспартную тэматыку. Цяпер Аляксандр выконвае экспертызы па дарожна-транспартных здарэннях, дапамагае разбірацца з ДТЗ, а таксама актыўна ўдзельнічае ў грамадзянскіх кампаніях, звязаных з дарожна-транспартнай тэматыкай.**

**Са студзеня гэтага года беларускія кіроўцы ездзяць па новых правілах: уступіла ў сілу новая рэдакцыя правілаў дарожнага руху. Якраз пра асаблівасці гэтага дакумента з Аляксандрам Канапліцкім размаўляе журналіст «НЧ» Вольга Хвоін.**



— Правілы дарожнага руху я перачытваю кожны месяц. Такая спецыфіка маёй працы. Правілы гэтыя мяняюцца штогод, і з кожным разам становяцца ўсё горшымі. Напрыклад, супярэчнасці пачынаюцца на этапе азнаямлення з тэрміналогіяй. Што ўваходзіць у паняцце «дарога»? Чытаем: "Адна ці некалькі праездджых частак, трамвайныя шляхі, тратуары, пешаходныя, веласіпедныя дарожкі». Значыць, прылеглыя тэрыторыі — двары — не ўваходзяць у дарогу. Чытаем далей: «Прылеглыя тэрыторыі — тэрыторыі, што непасрэдна прылягаюць да праездджай часткі дарогі». А ў першым пункце правілаў гаворыцца, што правілы дарожнага руху вызначаюць парадак руху на дарогах Рэспублікі Беларусь. Атрымліваецца, што ў дварах ПДР не дзейнічаюць. Такіх неадпаведнасцяў мноства. Вось яшчэ прыклад. Канец пад'ёма, машына ідзе на абгон, сутыкаецца на сустрэчнай — хто вінаваты? Цяпер абгон напрыканцы пад'ёма дазволены.

Дарожна-транспартнае здарэнне — здарэнне, што адбылося з удзелам хаця б аднаго механічнага транспартнага сродку, які знаходзіўся ў руху. Веласіпедыст ехаў па дарозе і разбіўся — ён удзельнік руху, ехаў па дарозе, а дарожнага здарэння няма. Аўтамабіль — механічны транспартны сродак, які мае не меней за чатыры колы, размешчаныя не менш чым на двух восях, за выключэннем колавых трактароў і самаходных машын. Механічны — гэта значыць з любым рухавіком. У гэтай частцы пытанняў няма. Пра чатыры колы — таксама нармалёва. Але вось наконт восяў — у сучасных аўтамабілях восяў няма. Восі засталіся ў асноўным толькі на прычэпах. У аўтамабіляў, як правіла незалежная падвеска ўсіх колаў. З гэтага вынікае, што любы транспартны сродак з незалежнай падвескай не з'яўляецца аўтамабілем і на яго кіраванне правы не патрэбныя.

***— Ці многа канфліктных сітуацый з удзелам веласіпедыстаў?***



— Ад іх проста адмахваюцца. Па цэнтральнаму праспекту рух веласіпедыстаў забаронены. Але калі веласіпедыста спыняць, дакументаў чалавек не прад'явіць, бо вазіць іх з сабою не абавязаны. Да ўсяго некуды трэба забіраць веласіпед. Занадта многа клопату. Больш проста даішніку зрабіць выгляд, што веласіпедыста ён не бачыць, а спыніць некалькі машын і аштрафаваць — дакументы, грошы ў кіроўцаў з сабой.

***— У Вас столькі нараканняў на змест ПДР, але ж іх пішуць людзі, якія мусяць ведаць прадмет.***

— У рэспубліканскай аўтаінспекцыі працуюць усяго каля 30 чалавек, і толькі некалькі з іх займаюцца распрацоўкай правілаў. Але большая частка гэтых людзей не стала на дарозе ў якасці інспектараў паставой службы. І яны не ведаюць, як створаныя імі правілы будуць дзейнічаць на дарозе. Ніхто не спрабуе зладзіць абмеркаванне правілаў, напрыклад, з выкладчыкамі аўташкол, якія працуюць з будучымі вадзіцелямі, і добра ведаюць усе хібы правілаў дарожнага руху. Найперш на дарозе мусіць быць бяспека. Атрымліваецца, што ДАІ лабіруе такім чынам нейкія свае інтарэсы? Людзі судзяцца па два-тры гады з супрацоўнікамі аўтаінспекцыі. Спрэчных сітуацый вельмі многа, людзі шукаюць экспертаў, калі вырашаюць падобныя праблемы, а незалежных экспертаў вельмі мала. І ў мяне часам фізічна не хапае часу, каб усіх ахвочых пракансультаваць, усім дапамагчы.

Што тычыцца ДТЗ, то схемы здарэнняў, якія афармляюць інспектары на месцы аварый, выклікаюць мноства пытанняў, невінаваты выглядае вінаватым, і суды бяруць да ўвагі такую інфармацыю. Я быў на прыёме ў начальніка ГУУС Леаніда Фармагея, у намесніка міністра, прапаноўваў бясплатна правесці заняткі з асабістым складам. «Не, — кажуць, — у нас усё добра». Даішнікі карыстаюцца тым, што могуць рэгуляваць парадак цэнаў і прапануюць прызнаць віну, заплаціць мінімальны штраф. І чалавек, натуральна, узважвае: суд, позва, экспертыза — усё каштуе грошай, а ці выйграе — не вядома.

«Адмазаць» вінаватага ў прынцыпе не складана. Уявім, я начальнік ДАІ. Прызначаю некага вінаватым, прапаную адкупіцца мінімальным штрафам. Калі чалавек пагодзіцца, то сапраўдны вінаваты можа спаць спакойна, калі ж пойдзе судзіцца, то можна зацягнуць разгляд справы, а потым напісаць заключэнне, што тэрміны прыцягнення да адказнасці скончыліся. У народа ўжо прымаўка з'явілася: мяне «прызначылі» вінаватым.

Напрыклад, радарам «Візір» можна зрабіць любую хуткасць для статычнай машыны. То бок машына стаіць, а радар паказвае. што яна едзе і нават з перавышэннем хуткасці. І такіх радараў на ўсю Беларусь закуплены сотні, а можа і тысячы. Аўтар кнігі «Страты ў дарожным руху» спадар Врубель піша: штогод на дарогах Беларусь губляе каля чатырох мільярдаў умоўных адзінак, сацыяльныя страты складаюць каля 50 працэнтаў. Я не эканаміст, і прыводжу вам афіцыйныя лічбы, апублікаваныя ў 2003 годзе, а цяпер машын яшчэ больш. Як бачыце, страты складаюць блізу адной дзесятай бюджэту краіны. Просты прыклад: здараюцца на вуліцы ДТЗ, даішнікі вешаюць дарожны знак. Кіроўцы ў гэтым месцы скідваюць хуткасць, газуюць — палічыце, колькі маем у такіх месцах разбітых падвесак, стратаў паліва... У развітых краінах кошт жылля, што знаходзіцца побач са штучнымі перашкодамі на праездджай частцы, звычайна больш нізкі. А ў нас панакладалі «ляжачых паліцэйскіх», ніхто не думае пра экалогію…

Аднойчы пабачыў, як малююць разметку не адпаведна стандарту. Спыніўся, сказаў, што няправільна яны робяць. Адказалі: «Мужык, ты некуды ехаў? Ну і едзь далей, а ў нас белая фарба скончылася, таму жоўтай малюем».

***— Вы працавалі ў сістэме дзяржаўтаінспекцыі, таму «кухня» вядомая. Што ствараe глебу для карупцыі ў гэтай сферы ў Беларусі?***

— Ну, глядзіце. Кіроўца парушыў правілы дарожнага руху. Што яму прасцей: заплаціць афіцыйна ці без квітанцыі палову, бо каму трэба, каб штраф вісеў у картатэцы? Вось і адказ на пытанне — ёсць «вілка» пакаранняў «ад і да». Калі б было цвёрдае пакаранне за кожнае парушэнне, гэта істотна скараціла б магчымасці для карупцыі. Знак «хуткасць» — у кодэксе за парушэнне знака штраф адзін, за перавышэнне хуткасці — штраф іншы. Пакуль ёсць такія пытанні, будуць і розначытанні.

Скаргі ў пракуратуру, судовыя працэсы ў навязденні парадку дапамагаюць мала. Далёка не ўсе пракуроры і суддзі ведаюць спецыфіку і тонкасці такіх спраў. Я быў на стажыроўцы ў Германіі, і там справы па дарожна-транспартных здарэннях вядзе адмысловая катэгорыя суддзяў. А калі чалавек нават правоў кіроўцы не мае, то як ён можа разбірацца ў спрэчных дарожных сітуацыях?

Беларускія кіроўцы баяцца карыстацца магчымасцямі спрошчанага афармлення ДТЗ з прычыны няўпэўненасці ў ацэнцы першапачатковай шкоды, — заявіла начальнік упраўлення метадалогіі арганізацыі і актуарных разлікаў Беларускага бюро па транспартным страхаванні Раіса Аляксандровіч. Па яе словах, праблемай таксама з'яўляецца выяўленне асобы, вінаватай у здзяйсненні ДТЗ, што ўдзельнікі здарэння павінны зрабіць самастойна.

З другой паловы 2010 года ў Беларусі кіроўцам прадстаўленая магчымасць аформіць ДТЗ без выкліку ДАІ пры наяўнасці некалькіх умоў: сярод іх — шкода не больш за 200 еўра, ДТЗ з удзелам не больш двух транспартных сродкаў, адсутнасць шкоды жыццю і здароўю людзей, наяўнасць у кіроўцаў правоў адпаведнай катэгорыі і дамоў абавязковага страхавання, адсутнасць прэтэнзій бакоў адзін да аднаго.

Па інфармацыі Раісы Аляксандровіч, за паўгода ў страхавыя арганізацыі пасля спрошчанага афармлення ДТЗ звярнулася ўсяго 413 чалавек, што складае 0,1% ад усіх заяўленых у гэты перыяд страхавых выпадкаў. Большасць кіроўцаў спадзяюцца, што выклік ДАІ ўзаконіць факт ДТЗ і дазволіць у канчатковым выніку атрымаць рэальнае пакрыццё, мяркуе спецыяліст.

Раіса Аляксандровіч таксама паведаміла, што абмяркоўваецца пытанне аб стварэнні інстытута страхавых камісараў, які дзейнічае ў Еўропе. Гэта робіцца з тым, каб з наступствамі ДТЗ, у якіх не пацярпелі людзі, разбіраліся страхавыя кампаніі, а не ДАІ.

З НАГОДЫ

# ВІТАННЕ СВАБОДЫ

Аляксей ХАДЫКА

**Апошнім часам розныя падзеі сплятаюцца ў настолькі цесны вузел, што схаваныя кантэксты робяцца гранічна зразумелымі.**

Вось паказальны шэраг. 8 сакавіка прадстаўнік МЗС Сербіі дэкляраваў, што следам за ЕС Сербія прызнае спіс забароненых да ўезду ў краіну беларускіх чыноўнікаў на чале з Лукашэнкам.

А знакаміты брытанскі драматург Том Стопард 7 сакавіка паведаміў, што яго ініцыятыва «Free Belarus Now» разам з Міхаілам Гарбачовым, Вацлавам Гавэлам, «Свабодным тэатрам» і шэрагам выдатных акцёраў (Джорджам Клуні, Майклам Дугласам, Маркам Нопфлерам, Сігуні Уівэр ды іншымі) з дапамогай юрыстаў падрыхтавала позвы па сітуацыі ў Беларусі.



Том Стопард 7 сакавіка паведаміў, што яго ініцыятыва «Free Belarus Now» з дапамогай юрыстаў падрыхтавала іскі па сітуацыі ў Беларусі

Яны пойдуць у чатыры інстытуцыі ААН: у Камітэт па правах чалавека, спецдакладчыку ААН па незалежнасці суддзяў і адвакатаў, спецдакладчыку па пытаннях абароны свабоды перакананняў і выказванняў і спецыяльнаму прадстаўніку генеральнага сакратара ААН у пытанні праваабаронцаў. А таксама ў артыкуле ад 8 сакавіка ў брытанскай газеце «The Independent» сэр Стопард заявіў, што пасля сведчанняў пра катаванні ў турме кандыдата ў прэзідэнты Алеся Міхалевіча (і іншых) наспеў час падачы ў цывільны суд прыватных іскаў асабіста супраць Лукашэнкі.

Але хацелася звярнуць увагу на тое, што пра наспяванне крытычнай сітуацыі для рэжыму сведчаць нават больш дробныя факты. Мы анансавалі прыезд у Мінск на канцэрт 7 сакавіка знакамітага металічнага гурта «АССЕРТ». Таго самага, які, не пазбаўлены шанавання гуманітарных каштоўнасцяў, праславіўся тым, што ў 1980-я ўсе прыбыткі ад аднаго са сваіх альбомаў пералічыў галадоўцам Эфіопіі.

На кароткай імправізаванай прэс-канферэнцыі ў мінскім аэрапорце фронтлайнер-гітарыст групы Вольф Хофман сказаў таксама нешта не тыповае для залётных знакамітасцяў — «гасцей сталіцы». Ён не адзначыў «чысціню і парадак у горадзе» (перад тым гурт канцэртаваў у Мінску ў 2005 годзе). Але сказаў, што музыкі абавязкова пройдуцца вуліцамі «гэтага прыгожага еўрапейскага горада», ад якога яны атрымліваюць асалоду, і абавязкова завітаюць у адзін з музеяў. А таксама пра тое, што ва ўзросце далёка за 40 яны нарэшце маюць найлепшую аўдыторыю: старыя прыхільнікі не згубіліся, а на канцэрты разам з імі прыходзяць маладзь і дзеці.

Так яно і было: у амаль поўным (а ўлічваючы танцпол — перапоўненым) Палацы спорту пад ашаламляльны гук танчылі і спявалі нават дзеткі трошкі старэйшыя за 5 гадоў. У сярэдзіне канцэрта прагучала адна з нешматлікіх павольных кампазіцый «Халодныя зімовыя вечары» са словамі: «Халодныя зімовыя вечары, халодныя зімовыя сны. Яны адбіваюць гукі майго сэрца — гэта смак свабоды…» Пасля песні саліст некалькі разоў звярнуўся да залы: «Падымайце знак перамогі — Victory — два пальцы дагары!» І ўся зала ўзняла рукі. А скончыўся двухгадзінны канцэрт адной з самых вядомых кампазіцый гурта, але таксама не выпадковай: «Balls to the wall». Не перасказаць некалькі яе радкоў проста немагчыма:

*«У свеце зашмат рабоў*
*памірае ад катаванняў і болю.*
*Зашмат людзей не бачаць,*
*што яны забіваюць самі сябе,*
*ідучы да вар'яцтва.*
*Залішне шмат людзей і не ведаюць,*
*што на чалавецтве ляжаць аковы.*
*І яны вераць,*
*што рабы заўсёды прайграюць,*
*І страх стрымлівае іх.*
*Але паглядзіце на гэтых пад праклёнам —*
*Гасподзь бласлаўляе іх.*
*Яны ідуць разбіць свае ланцугі*
*І ты не здолееш спыніць іх —*
*Гасподзь бласлаўляе іх…»*

І напрыканцы: *«Камяні ў сцяну — мы ідзем змагацца за свае правы… Пакажы мне знак свабоды!»*

Безумоўна, знакамітая песня часоў «Салідарнасці» Яцэка Качмарскага «А сцены зруйнуюцца» паўстала трошкі раней за песню «Balls to the wall» (1983) «АССЕРТ». Але свае песні «АССЕРТ» праспяваў беларусам вельмі своечасова.

Магчыма, не ўсе ў канцэртнай залі Палаца спорту ведалі словы песняў — але траціна гледачоў падпявала музыкам. Магчыма, не ўсе зразумелі сэнс паслання: бо ніхто не выгукаў палітычных слоганаў і не падымаў сцягоў.

Але культура відавочна замыкае сваё сэнсавае кола: мала хто ведае, што Том Стопард, які зараз змагаецца за свабоду Беларусі, калісьці шчыльна супрацоўнічаў з Фасбіндэрам, — аўтарам выдатнай стужкі «Замужжа Марыі Браўн». Стужкі пра цяжкае падыманне з каленяў укрыжаванай на раздарожжы гісторыі паваеннай Германіі. І зараз нямецкі гурт кажа беларусам на тонкай мове мастацтва: час уздымацца з каленяў.



КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

## ЗА ГЭТА І Б'ЮЦЬ



**Як сябе не засцерагай ад непрыемных адчуванняў, цалкам гэта ні ў каго не атрымліваецца зрабіць. То святло пагасне падчас трансляцыі футбольнага матчу, то ў краму малако не завязуць. І амаль немагчыма пазбегнуць катэгарычных меркаванняў пра слабасць беларускай апазіцыі.**

Дый якое ж там «амаль». Проста немагчыма. Зойдзеш у сеціва, толькі пра гэта і гамонка. Чужыя — увогуле катэгарычныя: Лукашэнка — дыктатар, але ж і апазіцыя слабая і неарганізаваная. Не так даўно пабывала ў краіне не вельмі вядомая дзяячка (дарэчы, некалі суайчынніца) і дзіву даецца: «Апазіцыя ў Беларусі вельмі слабая і раз'яднаная. Гэта факт».

Дарэчы, дзяўчына прыехала з вельмі дэмакратычнай еўрапейскай краіны — манархіі, дзе нават кароль у сваіх высокіх справах кіруецца заканадаўствам. Дзе ніхто нават і не падумае пра тое, каб стварыць такую выбарчую камісію, якая б падлічвала галасы на карысць толькі аднаго кандыдата.

Цытую далей: «Адміністрацыі Лукашэнкі не трэба было нічога фальсіфікаваць на выбарах або апранаць «яжовыя рукавіцы». У рэжыму ёсць даволі моцная падтрымка беларускага народа. Вядома ж, не 80% галасоў. Прыкладна 40–45%. Гэтага б хапіла для перамогі на выбарах». Насамрэч, магло б і хапіць. Каб была ў яго такая задума — правесці нарэшце гэтыя выбары.

Тэлефануе знаёмы, як кажуць, «кіраўнік сярэдняга звяна» на адным з мінскіх прадпрыемстваў. Ён з калегамі даволі актыўна рыхтаваўся да гэтай падзеі (выбараў). Што яны будуць галасаваць «супраць», сумневу не было. Раіліся, за каго прагаласаваць, за якую праграму. І таму расчараваныя: «У яго такіх працэнтаў не было нават на піку папулярнасці». Людзі ведаюць, што кажуць. Як хутка час бяжыць, як хутка ў жыцці ўсё мяняецца! Раней лічылі за свята схадзіць на «кожную Плошчу», а зараз пад рукой нітрагліцэрын трымаеш. Пачнуць даганяць, сам па сабе здохнеш. А ўсё-ткі думаеш — трэба было схадзіць…

Суседка ляжала падчас «кампаніі» ў лякарні. Жыла, можна сказаць, у часовым палітычным жаночым калектыве. Дзе самае рознае «перацірацца» ў доўгіх размовах пра тое, што было, ёсць і будзе. Своеасаблівая жаночая партыя «Надзея». Аказалася, не. Як скрыню па палатах насілі, амаль кожная аб'явіла, што «за гэтага» нізашто не прагаласуе. А як пачулі пра вынікі галасавання — адно пытанне: «Як? Як такое магло здарыцца? Выходзіць, што нас падманваюць, за нос водзяць?..»

Выходзіць. І якім бы «простым» не быў чалавек, яго такое становішча задаволіць не можа. А людзі на самай справе вельмі далёкія ад палітыкі. Ім падаецца, што дастаткова падаць свой голас, і яго ўлічаць.

Маняць і праз тэлебачанне і газеты. У ход ідзе ўвесь арсенал палітычнай дэмагогіі, напрацаваны шматлікімі гебельсамі. Прыкладам, не кажуць праўды. Памятаю, напярэдадні рэферэндуму 1996 года ў рэдакцыю забег нехта ад Вардамацкага. Яны праводзілі апытанне, як хто збіраецца галасаваць. Атрымлівалася, што лукашэнкаўскія папраўкі да Канстытуцыі падтрымлівае большасць рэспандэнтаў. Але сітуацыя змянілася на процілеглую пасля таго, як тым жа самым людзям прапанавалі ўважліва прачытаць і асэнсаваць гэтыя папраўкі. Найбольш выразна гэта праяўлялася ў пытанні аб праве прэзідэнта фармаваць свой уласны не падкантрольны нікому бюджэт.

Ёсць сярод беларусаў і натуральныя дурні, але ж відавочна, што для фармавання пастаяннай «канстытуцыйнай большасці» іх колькасці не хапае.

Сапраўды, падтрымка ў Лукашэнкі была. Але не такая выключная, каб ён свае непамерныя палітычныя амбіцыі мог задавальняць законнымі сродкамі. Каб не пэцкаць рукі, або, крый Бог, не надзяваць «яжовыя рукавіцы». Доказам таму сталі выбары ў Вярхоўны Савет 1995 года. Ён тады нудна тлумачыў, што яму не трэба дадатковых паўнамоцтваў, бо і так ёсць — царскія. І раптам непасрэдна на выбарчым участку заклікаў выбаршчыкаў не галасаваць, бо гэтыя абавязкова падмануць.

Але выбары ў ВС усё ж такі адбыліся, і парламент аказаўся не такім ужо і ручным. Ледзь да імпічменту справа не дайшла, давялося ненавісны «орган народаўладдзя» сілай разганяць і арганізацыйна ліквідоўваць.

Натуральна, усё зачысцілі, падмялі, каб і следу на засталося. Далей можна было б ладзіць «настоящие» выбары. Канкурэнтныя, празрыстыя, з удзелам назіральнікаў, а галоўнае, прадстаўнікоў кандыдатаў пры падліку галасоў. Пасля трэба было, хай сабе 10, 15, 20% месцаў у палаце аддаваць апазіцыі. А тыя б вэрхалу нарабілі. А калі 40–45%, што цалкам адпавядае логіцы палітычнай сітуацыі, Лукашэнка не змог бы прыбраць да рук нават самы лаяльны парламент.

Пачалася б рэальная палітыка з характэрным для яе зрываннем усіх і ўсялякіх масак. Праз нейкі час давялося б з'язджаць са сталіцы ды дапамагаць Галіне Радзівонаўне апрацоўваць «фамільныя соткі».

Не, спадарства, апазіцыя моцная. За гэта і б'юць…

ЗВАРОТ

# ПРАПАНОВЫ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

**9 сакавіка ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і ў Савет міністраў перададзены калектыўны зварот па праекце Закона «Аб некамерцыйных арганізацыях».**

Зварот падпісалі 110 некамерцыйных арганізацыяў розных арганізацыйна-прававых формаў і накірункаў дзейнасці, якія аб'ядноўваюць у сваіх шэрагах больш за 270 тысяч сяброў. Гэта самая маштабная акцыя лабіравання агульных інтарэсаў з боку беларускіх арганізацыяў грамадзянскай супольнасці.

Калектыўны зварот быў ініцыяваны спецыялістамі Цэнтра прававой трансфармацыі і Асамблеі няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў на падставе меркаванняў некамерцыйных арганізацыяў, інтарэсы якіх закранае новы законапраект. З улікам заключэнняў з боку айчынных і замежных экспертаў арганізацыі грамадзянскай супольнасці краіны выпрацавалі ўзгоднены супольны падыход да зместу праекта новага закона.

Акцыя па падпісанні звароту стала самай маштабнай спробай супольнага адстойвання інтарэсаў айчынных няўрадавых арганізацыяў у справе заканатворчасці. 110 юрыдычных асобаў, што далучыліся да дакумента, прадстаўляюць беларускую грамадзянскую супольнасць у яе разнастайных праявах — ад дабрачынных фондаў і экалагічных установаў да сацыяльных, праваабарончых, моладзевых і жаночых і іншых грамадскіх аб'яднанняў. Да акцыі таксама далучыліся аб'яднанні прадпрымальнікаў і іншыя асацыяцыі, рэлігійныя арганізацыі, партыі і прафсаюзы.

Ініцыятары калектыўнага звароту разлічваюць, што ў выпадку прыняцця закона «Аб некамерцыйных арганізацыях» у ім будзе ўлічаная заяўленая ў калектыўным звароце агульная пазіцыя суб'ектаў, на якіх будзе распаўсюджвацца яго дзеянне. У далейшым для паўнавартаснага працягнення грамадскасці да працы па абмеркаванні і ўдасканаленні праекта аўтары звароту прапануюць арганізаваць адкрытыя для ўсіх зацікаўленых арганізацыяў мерапрыемствы па яго абмеркаванні.

З тэкстам калектыўнага звароту ў парламент і ўрад па праекце Закона «Аб некамерцыйных арганізацыях» можна азнаёміцца на сайце Цэнтра прававой трансфармацыі: http://lawtrend.org/ru/data/650/

НАША ПОШТА

# НАСТАЎНІК, ХТО ТЫ?

**Якую будучыню рыхтуюць для краіны людзі, у якіх зараз за партамі сядзяць дзеці і падлеткі? Настаўніца, якая даслала ліст у рэдакцыю, распавядае пра свой цяжкі досвед зносінаў з калегамі. Школьнае нявольніцтва ці сумленная грамадзянская пазіцыя? Гэта пытанне і ўздымае ветэран педагагічнай працы А. Краўцова з Мінску.**



Пасля пякучага болю падзей 19 снежня часта сустракаеш у друку звесткі пра хлуслівыя паводзіны настаўнікаў, якія ўдзельнічалі ў выбарчых камісіях. Пра кіраўнікоў школ, якія падбухторвалі падначаленых да датэрміновага галасавання і збору подпісаў за «адзінага». А хто ж, як не настаўнік, павінен стаяць за праўду, вучыць выхаванцаў смеласці і патрыятызму сродкамі ведаў, уласным інтэлектам, высакароднасцю сваёй асобы.

Яшчэ ў перадвыбарчы час нават выпадковыя гутаркі з настаўнікамі пакідалі цяжкае ўражанне. «Я палітыкай не займаюся, я настаўніца біялогіі», — увільвала мая суразмоўца ад тэмы выбараў. «Павялічылі заробкі, значыць, трэба галасаваць за «бацьку», — гаварыла мая суседка-пенсіянерка, якая да гэтага часу працуе ў школе. «І чаго лезуць, што ім трэба?» (пра кандыдатаў у прэзідэнты).

На маю заўвагу пра неабходнасць перамен у краіне, якую можа здзейсніць новы прэзідэнт, чую: «Гэта краіна не для перамен» (былы дырэктар вучэбна-вытворчага камбіната, гісторык па адукацыі).

А ўжо пасля выбараў чула нават абразы і абурэнне не дзеяннямі ўлады і праваахоўных органаў, а ўсё тых жа кандыдатаў у прэзідэнты: «Гультаі і дармаеды, рабіць не хочуць, ідуць у палітыку, каб жыць на замежныя грошы». (Так казала настаўніца з 40-гадовым стажам, якая жыве ў прыватным доме, чакае зносу і атрымання кватэры ўжо 30 гадоў. Ёй часта не бывае чым тапіць печ, сядзяць у холадзе. Брыкет і дровы прывезлі толькі 31 снежня пад сустрэчу Новага года).

На маю заўвагу, што ўлады жывуць на яе грошы, даючы мізэрную пенсію за яе цяжкую працу, маўчыць, размову не прадаўжае.

«Навошта ішлі на Плошчу? Правільна зрабілі, што пабілі іх там, болей не пойдуць». «Як ты можаш так разважаць? Я заўсёды нервуюся, калі гавару з табой. Сталіна няма на іх, то быў бы парадак». На мае доказы, што Сталін — забойца мільёнаў людзей, стаіць на сваім: «Гэта ўсё прыдумалі ворагі. Носяць крыжы, ставяць. Паказуха гэта ўжо абрыдла». (Гэта казала настаўніца гісторыі, у якой маці спалілі фашысты ў вёсцы. Дачка — выкладчыца БДУ, выхаваная такой маці, наўрад ці гаворыць праўду студэнтам. Супакойвае толькі тое, што студэнты ў свядомасці вышэй на галаву за сваіх выкладчыкаў).

Лёс звёў мяне ў бальніцы з выкладчыцай з журфака. Яна сцвярджала, што была на прыёме ў Лукашэнкі і што гэта вельмі добры чалавек. «А ці запыталіся Вы ў яго пра лёс зніклых людзей?» Адказу няма.

А ўжо пасля перадачы «Плошча. Жалезам па шклу» істэрычны крык былой дырэктаркі школы пры тэлефоннай размове: «Падонкі! Выкарыстоўваюць грошы з Захаду». «Ты ж галасавала за Някляева. Што, і ён падонак? Чытай «Народную волю», там усю праўду пішуць пра падзеі». «У труне я бачыла гэту «Народную волю», — абуралася былая дырэктар школы. Зараз яна далучылася да царквы «Галгофа», якую актыўна наведвае, а пры сустрэчы імкнецца паўплываць і далучыць да сваёй веры, усё пужае д'яблам.

Мне нічога не заставалася, як і ёй нагадаць пра д'ябла, які яе спакусіў на гэткія словы пра экс-кандыдатаў у прэзідэнты, і пакласці трубку.

І ўсё ж не страчана надзея, калі чытаеш лісты назіральнікаў ад апазіцыі. Што знайшліся смелыя і сумленныя настаўнікі, якія чэсна і адказна падлічылі галасы выбаршчыкаў і далі праўдзівы працэнт вынікаў галасавання.

Хочацца нізка пакланіцца ім і паціснуць рукі з падзякай.

А тыя, хто змірыўся са школьным рабствам, баіцца сказаць слова праўды, а толькі ў адну дудку з начальствам, рыхтуюць для сябе, для сваіх выхаванцаў і для ўласных дзяцей не лепшую будучыню.

Ці гліне настаўнік глыток свабоды, залежыць толькі ад яго самога.

**P.S.** Што да мяне, то з вышэйзгаданымі калегамі не змагу болей падтрымліваць адносіны. Вельмі прыкра, але згоды з імі не будзе.

КАЛОНКА ЮРЫСТА

# ЛЬГОТЫ, ДАХОДЫ, ДАПАМОГА

**Мы працягваем публікацыю адказаў вядомага юрыста і праваабаронца Алега Волчака на пытанні тых грамадзян, якія звярнуліся да яго ў грамадскую прыёмную.**



- *Якія льготы мае сям'я з чатырма непаўналетнімі дзецьмі пры атрыманні крэдыту на будаўніцтва жылля?*
  *А. Казлоўская, Мінск*

Указ прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 года № 185 «Аб прадстаўленні грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) ці набыццё жылых памяшканняў» прадугледжвае наступныя льготы:

- Плата за карыстанне гэтымі крэдытамі на працягу тэрміну іх пагашэння ўсталёўваецца ў памеры 1 працэнта гадавых, зыходзячы з сумы запазычанасці на дату прадстаўлення дакументаў у Адкрытае акцыянернае таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк». У выпадку страты сям'ёй такога статусу падчас будаўніцтва або ў перыяд пагашэння льготнага крэдыту ўмовы льготнага крэдытавання не змяняюцца.
- Шматдзетным сем'ям фінансавая дапамога дзяржавы ў пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах прадстаўляецца ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, пасля ўводу жылых дамоў у эксплуатацыю (набыцця жылых памяшканняў), зыходзячы з колькасці непаўналетніх дзяцей на дату заключэння крэдытнай дамовы і сумы запазычанасці па льготных крэдытах на дату прадстаўлення крэдытаатрымальнікамі Адкрытаму акцыянернаму таварыству «Ашчадны банк «Беларусбанк» дакументаў, неабходных для яго атрымання, і ўсталявана пры наяўнасці чатырох непаўналетніх дзяцей у памеры 70 працэнтаў ад сумы запазычанасці па выдадзеных крэдытах.

Парадак прадстаўлення дапамогі ўстаноўлены Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27 верасня 2008 года № 1424 «Аб зацвярджэнні палажэння аб парадку прадстаўлення шматдзетным сем'ям фінансавай дапамогі дзяржавы ў пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах, атрыманых на будаўніцтва (рэканструкцыю) ці набыццё жылых памяшканняў».

- *Якім чынам лічыцца прыбытак, атрыманы праз Web Money: калі здымаюцца наяўныя, налічваюцца на банкаўскую карту з Web Money ці пры паступленні на віртуальны кашалёк? У якім заканадаўчым дакуменце РБ гэта вызначана?*
  *В. Палякоў, Брэст*

Падатковы Кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 19 снежня 2002 года № 166-З пунктам 1 артыкула 34 вызначае: «Прыбыткам прызнаецца эканамічная выгада ў грашовай ці натуральнай форме, што ўлічваецца ў выпадку магчымасці яе ацэнкі і ў той ступені, у якой такую выгаду можна ацаніць, і вызначаная ў дачыненні да пэўнага падатку, збору ў адпаведнасці з Асобай часткай дзейнага Кодэкса ці актамі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам, незалежна ад таго, дзе знаходзяцца грошы (банкаўская картка, электронны кашалёк і г.д.), гэта будзе лічыцца вашым прыбыткам.

- *Я знаходжуся ў адпачынку па доглядзе за дзіцём да трох гадоў. Таксама маю старэйшую дачку 14 гадоў. Атрымліваю па месцы працы на малодшае дзіця дапамогу. Мой муж праходзіў ваенную службу ў РФ, а ў дадзены момант з'яўляецца вайскоўцам запасу і атрымлівае пенсію ў РФ у памеры 4 900 расійскіх рублёў на месяц (прыкладна роўна 490 000 нашых беларускіх рублёў). Ці маю я права па сваім асноўным месцы працы звярнуцца, каб атрымаць дапамогу на дзіця з трох гадоў (г.зн. на старэйшую дачку да дасягнення ёй 18-гадовага ўзросту)?*
  *P.S. Муж пакуль з'яўляецца грамадзянінам РФ і займаецца зборам дакументаў для атрымання ў Беларусі віду на жыхарства.*
  *А. Дабравольская, Брэст*

Артыкул 15 Закона Рэспублікі Беларусь ад 30 кастрычніка 1992 года «Аб дзяржаўнай дапамозе сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» прадугледжвае, што права на дапамогу на дзяцей старэй 3 гадоў маюць бацькі, якія атрымліваюць дапамогу па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 14 САКАВІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.05** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 01.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** «Дзелавое жыццё».
**08.30** У свеце матораў.
**09.10** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**10.05** «Здароўе».
**10.35** «Культурныя людзі». Інфармацыйна-забаўляльная праграма.
**11.05** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**12.10** Меладрама «Рыта» (Расія).
**14.05** Дак.-біяграфічны цыкл «Мая праўда».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Nota Bene.
**16.30** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.25** Серыял «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**18.25** «Акно ў Еўропу».
**19.30** «КЕНО».
**19.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**20.00** Відэафільм АТН «Анархія. Прамое дзеянне».
**21.00** «Панарама».
**21.45** «Камандзіроўка. Журналісцкае расследаванне».
**22.00** Серыял «Абдуры мяне-2» (ЗША).
**23.15** Баявік «Каралі вуліц» (ЗША).
**01.15** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адчынены фармат».
**22.10** «След».
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Жанчыны хочуць танчыць».
**00.20** «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Вар'яцкі лістапад». Расія, 2008 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** Фільм «Двойчы ўчора». ЗША - Германія - Францыя - Вялікабрытанія - Іспанія, 1998 г.

---

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.15** Меладрама «Вялікія надзеі» (ЗША).
**12.10** Пра мастацтва.
**12.35** Школа рамонту.
**13.35** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.35** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.25** Навіны надвор'я.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.45** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**17.50** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Хакей. КХЛ. Плэй-оф. Паўфінал канферэнцыі «Захад». Матч 4-ы. У перапынку : Калыханка.
**21.35** Тэлебарометр.
**21.40** Беларуская часіна.
**22.45** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**00.00** Авертайм.
**00.30** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Пакой смеху».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Крыж супраць свастыкі». Дакументальны фільм.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** Прэм'ера. «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.15** «Гарадок». Дайджэст.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Падарунак лёсу».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** «Нічога асабістага».
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** «Весткі.ru».
**00.05** «Апошняя роля. Георгій Юматаў». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.20** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Вострасюжэтны серыял «Ганчакі».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Мент у законе».
**21.35** Прэм'ера. Серыял «Тэрмінал».
**23.45** «Сумленны панядзелак».
**00.35** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). Мужчыны і жанчыны. Спрынт вольным стылем.
**10.30, 20.45** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Жанчыны. Эстафета.
**11.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Індыян-Уэлс). Дзень 5-ы. Прамая трансляцыя.
**15.10** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**15.15** Веласпорт. Велагонка. 5-ы этап.
**16.00** Веласпорт. Велагонка (Францыя). 6-ы этап. Прамая трансляцыя.
**17.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.30** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Індыян-Уэлс). 1/16 фіналу. Прамая трансляцыя.
**01.15** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30, 12.05** «Беспрацоўныя панядзелкі», маст. фільм, 2002 г., Іспанія–Італія–Францыя.
**09.25, 13.55** Дакументальная гадзіна: ««Курск» – субмарына ў каламутнай вадзе», дак. фільм, 2009 г., Вялікабрытанія.
**10.35** ПраСвет.
**11.05** Эксперт.
**11.30** Басанож па свеце.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**15.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**15.25** ПраСвет.
**15.55** Эксперт.
**16.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.30** Басанож па свеце.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**17.35** «Час гонару», серыял: 20 серыя.
**18.25** Хто ёсць кім?: «Лідаркі», 2010 г., Польшча.
**18.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**18.55** «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 2.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Еўропа сёння.
**20.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.35** Без рэтушы: «Амазонкі глыбокіх крыніц», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Прыватная калекцыя.
**21.55** «Заказное забойства», маст. фільм, 1984 г., Вялікабрытанія.
**23.25** Аб'ектыў .
**23.50** Гарачы каментар.

## 15 САКАВІКА, АЎТОРАК

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.55, 18.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 01.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**11.40** Камандзіроўка. Журналісцкае расследаванне.
**12.10** Гістарычная драма «Анастасія Слуцкая» («Беларусьфільм»).
**14.05** Відэафільм АТН «Анархія. Прамое дзеянне».
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Патрабуецца».
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў-2».
**16.55** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Серыял «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Баварыя - Інтэр. Прамая трансляцыя.
**23.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Манчэстэр Юнайтэд - Марсэль.
**01.55** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Шматсер. фільм «Адплата».
**22.20** «След».
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.05** «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**00.55** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «Вар'яцкі лістапад». Расія, 2008 г.
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Халасцякі». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** Прэм'ера! «Хірамант 2». Серыял.
**23.55** «Водбліскі». Серыял.

---

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.40** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.45** Меладрама «Прахіндыяда, або Бег на месцы» (СССР).
**12.25** Авертайм.
**12.55** «Запал па культуры».
**13.40** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.45** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.45** Пазакласная гадзіна.
**16.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Меладрама «Прахіндыяда, або Бег на месцы» (СССР).
**20.50** «Калыханка».
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Беларуская часіна.
**22.15** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.55** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.30** «Спорт-кадр».
**00.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Зорка Барыса Штокалава». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** «Кулагін і партнёры».
**12.15** Тэлесерыял «Падарунак лёсу».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** Прэм'ера. «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.15** «Гарадок». Дайджэст.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Падарунак лёсу».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Кулебякай па дыктатары. Гастранамічная настальгія». Дак. фільм.

### НТВ

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.20** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.25** «Кватэрнае пытанне».
**11.25** «Жаночы погляд».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Вострасюжэтны серыял «Ганчакі».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Мент у законе».
**21.35** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінал».
**23.45** «Капітал.RU».

### EUROSPORT

**09.30** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Жанчыны. Эстафета.
**10.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130.
**11.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**11.45** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA у ЗША. 1/16 фіналу.
**16.00** Веласпорт. Велагонка (Францыя). 7-ы этап. Прамая трансляцыя.
**17.30** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**18.45** Тэніс. Турнір WTA у ЗША. 1/16 фіналу.
**20.00** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Індыян-Уэлс). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**00.00** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit. Часопіс.
**00.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету. Прэв'ю.
**00.45** Веласпорт. Велагонка (Францыя). 7-ы этап.
**01.30** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Жанчыны. Эстафета.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Гняздо», серыял: 8 серыя.
**08.25** «Час гонару», серыял: 20 серыя.
**09.10** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**09.40** Еўропа сёння.
**10.10** «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 2.
**10.40** Прыватная калекцыя.
**11.10** Без рэтушы: «Амазонкі глыбокіх крыніц», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**11.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**11.40** Хто ёсць кім?: «Лідаркі», 2010 г.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Гняздо», серыял: 8 серыя.
**12.55** «Час гонару», серыял: 20 серыя.
**13.40** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**14.10** Еўропа сёння.
**14.40** «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 2.
**15.10** Прыватная калекцыя .
**15.40** Без рэтушы: «Амазонкі глыбокіх крыніц», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**16.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.10** Хто ёсць кім?: «Лідаркі», 2010 г., Польшча.
**16.25** «Ваўчыная маці», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**17.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 28 серыя.
**18.30** ПраСвет.
**18.55** Два на два (тэледыскусія).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Праект «Будучыня».
**20.25** Навігатар.
**20.40** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Асабісты капітал.
**21.40** Рэпартэр.
**22.05** «Доктар Марцін», серыял: 28 серыя.
**22.50** Басанож па свеце.
**23.15** Аб'ектыў.
**23.40** Гарачы каментар.

## 18 САКАВІКА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 00.05** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**11.40** Відэафільм АТН «Добруш. Горад мастоў» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Меладрама «Калі ты мяне чуеш» (Украіна).
**14.05** «Школа доктара Камароўскага». Ток-шоў (Украіна).
**14.30** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Патрабуецца.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў-2».
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.55** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Камедыйная драма «Кіруючы палётамі» (ЗША-Германія).
**00.15** «Эпоха».
**01.10** Дак. цыкл «Зброя будучыні» (ЗША).
**02.00** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Штó? Дзе? Калі?» у Беларусі. Вясновая серыя гульняў.
**22.25** «Фабрыка зорак. Вяртанне».
**00.35** «Наша Беларашка».
**01.10** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Халасцякі». Серыял.
**15.30** «Хірамант 2». Серыял.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Вайна прыгажунь». Францыя, 2008 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.15** Фільм «Падзямелле цмокаў»». ЗША - Чэхія, 2000 г.
**02.05** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Час футболу.
**08.35** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.40** Дэтэктыў «Адгалоскі» (Францыя).
**12.35** Кінаспробы.
**13.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.00** Жывы гук.
**14.45** Гаспадар.
**15.20** Пазакласная гадзіна.
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Прыгодніцкі дэтэктыў «Бармэн з «Залатога якара» (СССР).
**20.35** «Калыханка».
**20.50** Тэлебарометр.
**20.55** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**21.55** «Бітва экстрасэнсаў».
**23.00** «Пра мастацтва».
**23.30** Дыялогі аб рыбалцы.
**00.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Падарунак лёсу».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** Прэм'ера. «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.15** «Гарадок». Дайджэст.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Прэм'ера. Фільм «Палын - трава акаянная». 2010 г.
**22.30** Фільм «Помста».
**00.25** Навіны - Беларусь.
**00.35** Фільм «Рабінавыя ночы».

### НТВ

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Вочная стаўка».
**12.10** «Да суду».
**13.35** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.05** Прэм'ера. «Дзеці. Гісторыя ўсерасійскага зману».
**23.05** Крымінальны трылер «Рабаванне на Бэйкер-Стрыт».

### EUROSPORT

**09.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Славеніі (Планіца). HS 215. Кваліфікацыя.
**10.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Швейцарыі (Ленцэрхайдэ). Жанчыны. Слалам. Прамая трансляцыя.
**11.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Швейцарыі (Ленцэрхайдэ). Мужчыны. Слалам-гігант. Прамая трансляцыя.
**11.55** Горныя лыжы. SKI Girls. Часопіс.
**12.00** Біятлон. Кубак свету ў Нарвегіі (Холмелколен). Жанчыны. Спрынт.
**13.00** Футбол. УЕФА. Ліга чэмпіёнаў. Лёсаванне. Прамая трансляцыя.
**14.00** Футбол. Ліга Еўропы. Лёсаванне. Прамая трансляцыя.
**14.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Швецыі (Фалун). Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**15.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Швейцарыі (Ленцэрхайдэ). Мужчыны. Слалам-гігант. Агляд.
**15.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Швецыі. Мужчыны. Пралог. Прамая трансляцыя.
**16.15** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Славеніі. HS 215. Прамая трансляцыя.
**18.00** Снукер. «Players Tour Championship». Фінал. Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**20.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.55** Тэніс. Турнір WTA у ЗША. 1/4 фінала.
**22.00** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Індыян-Уэлс). 1/2 фіналу. Прамая трансляцыя.
**23.45** Снукер. «Players Tour Championship». Фінал. Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**01.25** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit. Часопіс.
**01.45** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Славеніі (Планіца). HS 215.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Герой года», маст. фільм, 1986 г., Польшча.
**09.20** Праект «Будучыня».
**09.50** «Школа на санцапёку», серыял.
**10.15** Форум (ток-шоу).
**11.00** Рэпартэр.
**11.25** Невядомая Беларусь: «Няскораная», дак. фільм, 2010 г., Беларусь: ч. 2.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Герой года», маст. фільм, 1986 г., Польшча.
**13.55** Праект «Будучыня».
**14.25** «Школа на санцапёку», серыял.
**14.50** Форум (ток-шоу).
**15.35** Рэпартэр.
**16.05** Вагон.
**16.10** Невядомая Беларусь: «Няскораная», дак. фільм, 2010 г., Беларусь: ч. 2.
**16.45** Гісторыя пад знакам Пагоні .
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Таямніца Сагалі», серыял: 3 серыя.
**17.30** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**18.20** Форум (ток-шоу).
**19.05** Маю права (прававая праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах.
**20.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.30** «Аляксандр Ісачоў. Майстар і Афрадыта», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** «Тры трэйлера», дак. фільм, 1998 г.
**22.05** «Пітбуль», серыял: 3 серыя.
**22.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.
**23.00** Аб'ектыў.
**23.25** Гарачы каментар.

## 19 САКАВІКА, СУБОТА

**07.10** Мультфільмы.
**07.30** Існасць.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.15** «Школа доктара Камароўскага». Ток-шоў (Украіна).
**10.45** Камедыйны серыял «Сваты-3».
**12.10** Камедыя «Жаніцьба Бальзамінава» (СССР).
**14.05** Відэафільм «Модная масленіца».
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Nota Bene.
**16.40** Дак. цыкл «Атлас «Дыскаверы».
**17.40** Відэафільм АТН «Стоўбцы. Зямля пясняра» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Піцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «OFF STAGE LIFE».
**19.45** Камедыйны серыял «Вясковая камедыя» (Расія). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.40** Фільм тыдня. Камедыя «Невыносная жорсткасць» (ЗША).
**23.40** Фантастычная меладрама «Змярканне. Сага. Маладзік».
**01.55** Дзень спорту.

---

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** «Смак жыцця».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** «Хвіліна славы».
**15.00** Асяроддзе пасялення.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Камедыя «Ужо хто бы казаў».
**17.50** «Адзін супраць усіх».
**18.50** АНТ прадстаўляе: «Я спяваю».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Здабытак Рэспублікі».
**23.20** «Пражэктарпэрысхілтан».
**00.00** Прыгодніцкі фільм «Залатое сячэнне».

---

**06.30** «Анфас».
**06.45** Фільм «Міхайла Ламаносаў. Ад нетраў сваіх». СССР, 1986 г. 1-я серыя.
**08.00** Фільм «Вайна прыгажунь». Францыя, 2008 г.
**09.35** «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.40** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.05** Фільм «Станцыйны наглядчык». СССР, 1972 г.
**15.25** «Далёкія сваякі».
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** Фільм «Сцерва». Расія - Украіна, 2009 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Перагаворшчык». ЗША - Германія, 1998 г.
**23.50** «Прафесійны бокс».
**01.10** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**07.05** Нашы тэсты.
**07.35** Усё аб бяспецы.
**08.05** Рэальны свет.
**08.40** Дыялогі аб рыбалцы.
**09.15** Жансавет.
**09.50** Дача здароўя.
**10.35** Тэлебарометр.
**10.40** «Ты і Я». Забаўляльнае ток-шоў (Расія).
**11.45** «Запал па культуры».
**12.25** «Лабірынты: невядомая Літва». Фільм першы.
**12.55** Фільм-фэнтэзі «Легенда» (ЗША - Вялікабрытанія).
**14.55** Біятлон. Фінал Кубка свету-2011. Гонка пераследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**15.45** Гумарыстычная праграма (Расія).
**16.55** Біятлон. Фінал Кубка свету-2011. Гонка пераследу. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**17.40** Прэм'ера. Рамантычная камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета» (ЗША - Іспанія).
**19.30** Тэлебарометр.
**19.35** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**20.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Эвертан-Фулхэм.
**22.35** Жывы гук.
**23.20** Канцэрт Ennio Morricone (Live in Venice) (Італія).

### РОССИЯ

**07.00** «Уся Расія».
**07.15** Фільм «Рабінавыя ночы».
**08.30** Фільм «Помста».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Палын - трава акаянная». 2010 г.
**13.45** «Уся Расія».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.50** «Улада факту». Дак. фільм.
**15.40** «Руская народная група «Боні М». Дакументальны фільм.
**16.40** «Пакой смеху».
**17.40** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Фільм «Праязны квіток». 2011 г.
**00.15** «Дзяўчаты».
**00.4** Камедыя «Руская гульня».

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Жаночы погляд».
**14.10** Камедыя «Карсіканец».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Развод па-руску».
**17.20** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Рускія сенсацыі».
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.20** «Музычны рынг НТБ».
**00.40** «Нерэальная палітыка».
**01.10** Фільм «Класік».

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit. Часопіс.
**09.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Швейцарыі (Ленцэрхайдэ). Жанчыны. Слалам. Прамая трансляцыя.
**11.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Славеніі (Планіца). HS 215. Камандныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**12.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Швейцарыі (Ленцэрхайдэ). Мужчыны. Слалам. Прамая трансляцыя.
**13.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Швейцарыі (Ленцэрхайдэ). Жанчыны. Слалам-гігант. Прамая трансляцыя.
**14.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Швецыі (Фалун). Жанчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**15.00** Біятлон. Кубак свету ў Нарвегіі (Халмелколен). Жанчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**15.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Швецыі (Фалун). Мужчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**16.45** Біятлон. Кубак свету ў Нарвегіі (Халмелколен). Мужчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**19.00** Веласпорт. Велагонка (Італія). Прамая трансляцыя.
**20.00** Конны спорт. «Global Champions Tour» у Катары. Прамая трансляцыя.
**21.30** Снукер. «Players Tour Championship». Фінал. 1/4 Фіналу. Прамая трансляцыя.
**00.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Даніі. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**02.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Славеніі (Планіца). HS 215. Камандныя спаборніцтвы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30, 12.15** На колах.
**08.00** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**08.45** «Таямніца Сагалі», серыял: 3 серыя.
**09.15** Калыханка для самых маленькіх.
**09.35** Басанож па свеце.
**10.05** Прыватная калекцыя.
**10.35** Эксперт.
**11.00** Маю права (прававая праграма).
**11.25** Госць «Белсату» .
**11.40** Без рэтушы: «Вацлаў Іваноўскі», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**12.00** Асабісты капітал.
**12.45** «Таямніца Сагалі», серыял: 3 серыя.
**13.10** Калыханка для самых маленькіх.
**13.40** Форум (ток-шоу).
**14.30** «Аляксандр Ісачоў. Майстар і Афрадыта», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**14.55** «Тры трэйлера», дак. фільм, 1998 г.
**15.25** Рэпартэр.
**15.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.05** «Ранча», серыял: 41 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 3 серыя.
**17.55** «Таямніца Нарыльскага паўстання», дак. фільм, 2005 г., Украіна.
**19.25** Вагон.
**19.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Еўропа сёння.
**20.20** Вагон.
**20.30** «Россия ХХ век. Взгляд на власть», 2009 г., Расія: ч. 3.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Два на два (тэледыскусія).
**21.45** Суботні сеанс: «У тупіку», маст. фільм, 2000 г., ЗША–Партугалія–Германія.
**23.10** Прыватная калекцыя.
**23.40** Аб'ектыў.

## 20 САКАВІКА, НЯДЗЕЛЯ

**07.55** Мультфільмы.
**08.45** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** У свеце матораў.
**10.15** «Культурныя людзі».
**10.45** Камедыйны серыял «Сваты-3».
**12.10** Псіхалагічная драма «Кепскі добры чалавек» (СССР).
**14.05** Хранікальна-дакументальны фільм цыклу «У інтэрасах нацыянальнай бяспекі».
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Відэафільм АТН «У кругазвароце алімпійскага руху».
**16.05** Рамантычная камедыя «Таму што я так хачу» (ЗША).
**18.05** Суперлато.
**19.15** Камедыйны серыял «Вясковая камедыя» (Расія). 2-я серыя.
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**22.30** Гістарычная драма «Сомерсбі» (ЗША-Францыя).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.15** Фазэнда.
**11.50** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.25** Прэм'ера. «Індыйскія ёгі сярод нас».
**13.25** Фільм «Дзеці Дон Кіхота».
**15.00** АНТ прадстаўляе: «Брэйн рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Давай ажэнімся!».
**17.25** «Эстрадны кактэйль».
**18.45** АНТ прадстаўляе: «Зачыстка».
**20.00** Контуры.
**21.05** Фільм «Лепш не бывае».
**23.35** Фільм «Дамавік».

**05.25** Фільм «Міхайла Ламаносаў. Ад нетраў сваіх». СССР, 1986 г. 2-я серыя.
**06.40** Фільм «Перагаворшчык». ЗША - Германія, 1998 г.
**09.00** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «Дача». СССР, 1973 г.
**15.35** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40** Фільм «Круты Джо». ЗША, 2001 г.
**22.35** Фільм «Дзень поўні». Расія, 1998 г.
**00.10** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.25** Дабравест.
**07.55** Мір вашай хаце.
**08.05** Рамантычная камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета» (ЗША - Іспанія).
**10.00** Медычныя таямніцы.
**10.40** Медычныя таямніцы +.
**10.55** Школа рамонту.
**12.00** Тэлебарометр.
**12.00** Нашы тэсты.
**12.45** Кінаспробы.
**13.05** «Правы чалавека».
**13.20** Бухта капітанаў.
**14.00** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**14.55** Біятлон. Фінал Кубка свету-2011. Гонка з масавым стартам. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**15.45** Гумарыстычная праграма (Расія).
**16.55** Біятлон. Фінал Кубка свету-2011. Гонка з масавым стартам. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Чэлсі - Манчэстэр Сіці. Прамая трансляцыя.
**19.55** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**21.00** «Навіны надвор'я».
**21.30** Смешная часіна.
**22.05** Рамантычная камедыя «Мой лепшы палюбоўнік» (ЗША).
**00.05** Культасвет.

**07.00** Мультфільмы.
**07.30** Фільм «Праязны квіток». 2011 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Мультфільмы.
**12.20** Фільм «Каманда «33».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Рамантыка раманса».
**15.35** Прэм'ера. «Гарады і Весі». Дакументальны фільм.
**16.35** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**16.55** Фільм «Справа была ў Пянькове».
**18.50** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2011.
**23.55** «Адмысловы карэспандэнт».
**01.05** Фільм «Чужыя лісты».

**07.40** Мультфільм «Боцман і чыюк».
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне асаблівай рызыкі».
**08.50** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Баль на ўвесь свет».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Таямнічая Расія».
**14.10** «Апошняе слова». Вострасюжэтнае ток-шоў.
**15.15** «Сеанс з Кашпіроўскім. Экстрасэнсы».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. «Гісторыя ўсерасійскага зману».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.55** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.10** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**01.00** «Увага: вышук!».
**01.35** «Футбольная ноч».

**09.30** Аўтаспорт. Ле-Ман (Францыя).
**10.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Славеніі (Планіца). HS 215. Камандныя спаборніцтвы.
**11.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Славеніі. HS 215. Прамая трансляцыя.
**12.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Швейцарыі (Ленцэрхайдэ). Прамая трансляцыя.
**14.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Швецыі (Фалун). Жанчыны. 10 км. Прамая трансляцыя.
**15.00** Біятлон. Кубак свету ў Нарвегіі (Халмелколен). Жанчыны. Мас-старт. Прамая трансляцыя.
**15.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Швецыі (Фалун). Мужчыны 15 км. Прамая трансляцыя.
**17.00** Біятлон. Кубак свету ў Нарвегіі (Халмелколен). Жанчыны. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**17.40** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**17.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету (Бразілія). 1-ы заезд. Прамая трансляцыя.
**19.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету (Бразілія). 2-і заезд. Прамая трансляцыя.
**20.00** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Індыян-Уэлс). Фінал. Прамая трансляцыя.
**21.45** Снукер. «Players Tour Championship». Фінал. Прамая трансляцыя.
**00.00** Мотаспорт. Агляд. Часопіс.
**00.15** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Даніі. Жанчыны. Прамая трансляцыя.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 3 серыя.
**08.25** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**08.55** Калыханка для самых маленькіх.
**09.25** «Россия XX век. Взгляд на власть», 2009 г., Расія: ч. 3.
**09.50** Форум (ток-шоу).
**10.35** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**10.50** «Таямніца Нарыльскага паўстання», дак. фільм, 2005 г., Украіна.
**12.20** Два на два (тэледыскусія).
**12.50** Еўропа сёння.
**13.20** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**13.50** Калыханка для самых маленькіх.
**14.20** «У тупіку», маст. фільм, 2000 г., ЗША–Партугалія–Германія.
**15.45** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**15.55** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**16.05** «Ранча», серыял: 42 серыя.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Час гонару», серыял: 21 серыя.
**18.00** Дакументальная гадзіна: «Ганна, сем год на лініі фронту», дак. фільм, 2008 г., Расія.
**19.25** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.40** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**20.05** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**22.00** Фільматэка майстроў: «Дабранач», маст. фільм, 2007 г., ЗША–Вялікабрытанія.
**23.30** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.40** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Віцебск: (8 029) 308 49 78, Юрый;
Слуцк: (8 029) 364 42 60, Зінаіда;
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей;
(8 029) 178 31 68, Вольга.

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

## ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____________
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____________

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ________
Всего ________

Кассир

**Для тых, хто прымае рашэнні!**
Новы час
**www.novychas.org**

МЕРКАВАННЕ

# САМАЯ ВЯЛІКАЯ ТАЙНА ІСПАНСКАГА КАРАЛЕЎСТВА

**У атмасферы спрэчак і дэбатаў Іспанія адсвяткавала 30-ю гадавіну правалу вайсковага перавароту 1981 года — апошняй спробы перавароту ў гісторыі Еўропы. Чаму іспанцам не дае спакою гэтая дата, журналіст «НЧ» Алег Новікаў высвятляе ў іспанскага калегі Рыкарда Жардана.**



**Даведка:**

23 лютага 1981 года палкоўнік Антоніа Тэйера Маліна з групай жандараў (200 чалавек) падчас чарговага галасавання па кандыдатуры старшыні ўрада захапіў будынак парламенту з усімі дэпутатамі. Па ўсёй краіне пачаліся акцыі пратэсту супраць перавароту. Адначасова некаторыя гарнізоны падтрымалі путчыстаў. У ноч на 24 лютага кароль Хуан Карлас выступіў з прамовай на тэлебачанні, у якой асудзіў пераварот. На наступны дзень змоўшчыкі здаліся. З таго часу кароль успрымаецца найперш як знак нацыянальнага адзінства і гарант дэмакратычных свабодаў. Так, лідар іспанскіх камуністаў Санцьяга Карыльё, які за шэсць гадоў да перавароту называў караля «Хуанам Карласам Нядоўгім», 24 лютага выклікнуў перад тэлекамерамі: «Божа, барані караля!»

***— Чаму падзеі 23 лютага дасюль выклікаюць такі вялікі інтарэс у іспанскім грамадстве?***

— Пераход да дэмакратыі (transiciyn) пасля смерці Франка адбыўся на базе негалоснага кампрамісу з былой франкісцкай элітай. Канчатковыя дэталі гэтай дамовы дасюль не вядомыя. Іспанскае грамадства было цалкам выключана з працэсу перамоваў. Дасюль, нягледзячы на тое, што Іспанія — сябра ЕС і мае развітыя дэмакратычныя інстытуты, нормы transiciyn не перагледжаныя. Дастаткова загадаць справу суддзі Балтазара Гарсона, якому пагражае турма за спробу хаця б сімвалічна прыцягнуць да адказнасці тых, хто арганізоўваў рэпрэсіі ў часы Франка. Важную ролю ў блакаванні ўсялякіх спроб перагляду правілаў адыгрывае пазіцыя караля, якому прыпісваюць выратаванне дэмакратыі ў 1981 годзе. Правыя выданні спрабуюць прэзентаваць яго як ідэальнага лідара ва ўмовах пераходу краіны ад дыктатуры да дэмакратыі, прычым нават на глабальным узроўні. 23 лютага «ABC» — другая нацыянальная газета — выйшла пад загалоўкам «Бахрэйну (краіна, якая зараз ахопленая пратэстамі супраць мясцовай манархіі) патрэбны такі кароль, як Хуан Карлас».

***— Чаму сярод левых ёсць альтэрнатыўная кропка гледжання?***

— Таму што падобны падыход вельмі банальны. Шмат у гэтай гісторыі з пераваротам застаецца невядомым. Цалкам не высветлена, ці ведаў манарх пра падрыхтоўку перавароту і ці не браў сам у ім удзел? Усё атачэнне Хуана Карласа — былыя франкісцкія лідары, якія не маглі не ведаць настрояў у франкісцкім асяроддзі. Блізкім сябрам караля быў Альфонса Армада, якога ён прызначыў намеснікам начальніка штаба арміі за тыдзень да падзей 23 лютага. Армада на той час насіўся з ідэяй грамадзянска-мілітарнай акцыі, сэнс якой быў у тым, каб паўтарыць тое, што ў 1950-я гады зрабіў генерал Шарль дэ Голь, які са спасылкай на пагрозу вайсковага перавароту змяніў канстытуцыю на карысць моцнай выканаўчай вертыкалі. Перш за ўсё змены мусілі тычыцца 99-га артыкула Канстытуцыі, які б дазваляў каралю прызначаць прэм'ер-міністра па асабістаму выбару, нават без згоды дэпутацкай большасці ў парламенце. Аперацыя так і называлася — «Генерал дэ Голь». Усё гэта нарадзіла гіпотэзу пра тое, што Хуан Карлас мог сам інспіраваць змову або даць ёй зялёнае святло, каб пасля выставіць сябе выратавальнікам дэмакратыі, узняць свой аўтарытэт. На гэта, напрыклад, намякае каралева Сафія ў кнізе-інтэрв'ю «Каралева». Наўрад ці яна стала б казаць такое, не ўзгадніўшы гэта з мужам. Адзін з блізкіх да караля чыноўнікаў у сваіх мемуарах піша, што кароль у апошнія месяцы кіравання Адольфа Суарэса не раз выяўляў перад генераламі сваю незадаволенасць прэм'ерам, і яны маглі ўспрыняць гэта як сігнал да дзеяння.

***— Наколькі верагодная такая версія?***

—На думку большасці аналітыкаў, Хуан Карлас не мог жадаць ваеннага перавароту, нават калі б ён быў яму выгадны. Справа не толькі ў яго дэмакратычных перакананнях, але і ў асабістых матывах. Перад каралём, як і перад каралевай, увесь час стаяў прыклад брата Сафіі, караля Грэцыі Канстанціна, які падтрымаў рэжым «чорных палкоўнікаў», а яны праз некаторы час скінулі яго з трону. Акрамя таго, кароль памятаў, што Бурбоны доўгі час жылі ў эміграцыі пасля таго, як у Іспаніі была ўстаноўлена дыктатура Прыма дэ Рыверы. У любым выпадку, мы толькі гадаем. А праўду ведае толькі Хуан Карлас. Лічыцца, што гэта самая вялікая тайна іспанскага каралеўства.

***— Калі б не было 23 лютага, якой магла быць Іспанія?***

— Усё тады ішло да нейкай развязкі. Сітуацыя выходзіла з-пад кантролю, аб чым сведчыла адстаўка цэнтрысцкага ўраду Суарэса. Ні правыя, ні левыя не былі задаволеныя становішчам у краіне. Акрамя таго, гэта ўсё чымсьці нагадвала хаос часоў 2-ой рэспублікі, і сцэнар устанаўлення вайсковай дыктатуры накшталт рэжыму Франка папросту насіўся ў паветры. Аднак гісторыя вырашыла інакш. Цяперашняя Іспанія, безумоўна, шмат у чым прадукт 23 лютага 1981 года. Змоўшчыкі не перамаглі, аднак працэс радыкалізацыі прыпыніўся. Непрадказальная ноч з 23-га на 24-е лютага настолькі перапужала людзей, што яны былі гатовыя адмовіцца ад палітычных утопій і пачалі шанаваць тое, што маюць. Напрыклад, тады хутка былі прыпыненыя дэбаты наконт федэралізацыі дзяржавы, якой дабіваліся баскскія і каталонскія партыі. Кароль, які цяпер называўся «salvador de la patria» (выратавальнік радзімы), выкарыстаў карт-бланш, які займеў 23 лютага. Манархія атрымала поўную легітымізацыю.

***— Ці можа іспанская мадэль служыць мадэллю для другіх народаў, якія пераходзяць ад дэмакратыі да дыктатуры?***

— Дасюль цяжка сказаць, ці эра transiciyn увогуле цалкам закончылася. На гэты конт ёсць шмат меркаванняў. Transiciyn, у любым выпадку, даводзіць значнасць ролі арміі на пераходным этапе. Так, сярод сацыялістаў пасля 23 лютага ўзмацніліся пазіцыя тых, хто выступаў за ўступленне Іспаніі ў NATO. Па іх словах, сяброўства ў блоку было б лепшай перастрахоўкай ад новай спробы перавароту з боку рэакцыйных вайскоўцаў.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

У той час, як Блізкі Усход палае ў агні народнага гневу з-за адсутнасці дэмакратычнага прагрэсу, лёгка забыцца, што адзін з куткоў Еўропы па-ранейшаму адмаўляецца расстацца са сваім дыктатарскім мінулым. Аляксандр Лукашэнка, прэзідэнт Беларусі, кіраваў сваёй краінай жалезнай рукой амаль з тых часоў, як рэспубліка атрымала незалежнасць ад Савецкага Саюза ў 1994 годзе. Але за апошнія два месяца сілы бяспекі накінуліся на яго апанентаў з жорстасцю, якая нагадвае пра савецкія часы.

**«The Independent» (Вялікабрытанія)**

Лукашэнку трэба прадэманстраваць наяўнасць добрых сувязей з Расіяй, таму што гэта адзіная падстава, па якой ён, можа, патрэбны Захаду, і па якой на Захадзе патрэбна Беларусь. На жаль, сама па сабе Беларусь не вельмі патрэбная і не ўяўляе сёння адмысловай цікавасці, яна цікавая як пасярэднік, як вароты да Расіі. Нягледзячы на сапсаваныя адносіны, нягледзячы на тое, што Расія будуе абыходныя газа- і нафтаправоды, Лукашэнка кажа, што ў яго добрыя адносіны з Расіяй, і амерыканцы павінны, па ідэі, у гэта паверыць. Давайце глядзець па фактах. Расія будуе нафтаправод у абыход Беларусі, які пусціць беларускія аб'ёмы нафты ў абыход яе. Гэта кажа, прынамсі, пра недастатковую ступень даверу паміж Масквой і Мінскам.

**«Голос России» (Расія)**

Вашынгтон часта дзейнічае, зыходзячы з тэзісу пра тое, што дзеля супрацоўніцтва з Масквой давядзецца навязваць рашэнні расійскім суседзям. Але нядаўнія трагічныя падзеі ў Беларусі дэманструюць, што ўсё наадварот. ЗША і ЕС прапанавалі Лукашэнку стымулы ўзамен на правядзенне справядлівых выбараў, а Масква, якая стамілася ад ваганняў Лукашэнкі, пагразіла не прызнаць вынікі выбараў. Пасля гэтага Брусэль і Вашынгтон не паспрабавалі хоць бы абмеркаваць з Масквой сітуацыю ў Беларусі. Крэмль, здаецца, западозрыў, што Беларусь хочуць скрасці, і ў апошнюю хвіліну падтрымаў Лукашэнку. Вынікі выбараў не адпавядаюць нічым інтарэсам, акрамя інтарэсаў самога Лукашэнкі.

**«The New York Times» (ЗША)**

Прычыны такой жорсткай рэакцыі ўладаў на акцыю пратэсту (прысуды па справе 19 снежня) звязаныя з планамі Лукашэнкі адыграць назад усе крокі па лібералізацыі і дэмакратызацыі, якія ўлада зрабіла пад ціскам сусветнай супольнасці ў разліку на тое, што выбары будуць нарэшце прызнаныя. У перыяд так званай «беларускай адлігі» Лукашэнка з жахам выявіў, што народ гатовы шукаць яму альтэрнатыву. Цяпер прэзідэнт Беларусі не спыніцца на паўдарогі, пакуль не дасць усім зразумець, што так будзе з кожным, хто асмеліцца выступаць супраць яго. А гэта значыць, што чакаць мякчэйшых прысудаў не варта. Тым больш што суды над асноўнымі фігурантамі — тымі, хто нібы арганізаваў «масавыя беспарадкі», — яшчэ наперадзе.

**«Независимая газета» (Расія)**

Украінскі бок зрабіў усё, каб не абразіць Бацьку, матывуючы сваё недалучэнне да агульнай пазіцыі краін ЕС «працэдурнымі праблемамі». Спробы ўкраінскай улады манеўраваць паміж інтарэсамі Еўропы і добрымі адносінамі з «апошнім дыктатарам Еўропы» сведчаць перш за ўсё пра тое, што працэсы ў Мінску не выклікаюць асаблівага дыскамфорту ва ўладзе Украіны. З улікам тэмпаў, якімі ўкраінскі прэзідэнт канцэнтруе ўладу ў сваіх руках, не выключана, што прычына добрага стаўлення Украіны да рэжыму Лукашэнкі не столькі эканамічныя, колькі палітычныя светапогляды.

**«Українська правда» (Украіна)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### АРГЕНЦІНА. НОБЕЛЕЎСКІ ЛАЎРЭАТ СТАЎ НЕЎЯЗНЫМ



Марыа Варгас Льёса — славуты пісьменнік і апошні лаўрэат нобелеўскай прэміі па літаратуры, можа стаць персонай нон-грата ў Аргенціне. Льёса запрошаны на кніжны фестываль Feria del Libro, аднак вялікая група аргенцінскіх інтэлектуалаў лічыць, што там яму рабіць няма чаго. Прычына — ідэйныя забабоны лаўрэата. Будучы перакананым ліберталам, ён неаднаразова персанальна атакаваў былога аргенцінскага прэзідэнта Нестара Кіршнера за яго левы палітычны курс. На думку прыхільнікаў Кіршнера, візіт Льёсы будзе правакацыяй. У тым ліку супраць Крысціны Фернандэс дэ Кіршнер, жонкі Нестара, якая выконвае функцыі прэзідэнта Аргенціны. Льёса ў сваю чаргу кажа, што мае запрашэнне на Feria del Libro і абавязкова туды прыедзе. Хаця б таму, што апошні раз яму забаранілі ўезд у Аргенціну, калі ў гэтай краіне панавала вайсковая хунта. Варта згадаць, што ў часы дыктатуры ў Аргенціне таксама былі забароненыя ўсе творы Льёсы. Закладнікам усёй гэтай, здавалася, камічнай гісторыі аказалася якраз Крысціна Кіршнер. Як жонка Нестара, яна не жадае, каб гонар яе мужа быў пакрыўджаны. Не кажучы пра тое, што Кіршнер вельмі папулярны сярод простых аргенцінцаў, а гэта вельмі важна ў кантэксце хуткіх прэзідэнцкіх выбараў. З іншага боку, выглядаць цемрашалам прэзідэнт таксама не жадае.

**Па матэрыялах «La Pagina» (Аргенціна)**

### ІСПАНІЯ. ЛЕВЫЯ ПАТРАБУЮЦЬ ЗАБАРАНІЦЬ ШЛЯХТУ

Дэпутаты ад левых партый, прадстаўленых у іспанскім парламенце (былыя камуністы, каталонскія нацыяналісты і каталонскія ж зялёныя), прапанавалі радыкальны законапраект супраць іспанскай шляхты. Калі ён будзе прыняты, каралю ў будучым будзе забаронена надаваць арыстакратычныя тытулы. Сваю ініцыятыву левыя аргументуюць спасылкай на тое, што інстытут рыцарства — перажытак дыктатуры Франка. Менавіта каўдыльё ў далёкім 1948 годзе адмяніў закон, прыняты рэспубліканцамі, які ліквідаваў у Іспаніі падзел людзей на арыстакратаў і іншых грамадзян. Пасля пастановы Франка ад 1948 года арыстакратычныя тытулы зноў сталі ўжывацца, а кароль атрымаў права іх надаваць. На цяперашні час у краіне 2800 сямей з блакітнай крывёй. Увогуле, уздым якабінскіх настрояў сярод левых — дзіўная рэч. Раней яны патрабавалі пазбавіць тытулаў толькі тых, хто атрымаў іх у часы дыктатуры. Сярод іх непасрэдна сам Франка і яго блізкія. Акрамя таго, можна ўзгадаць, што, у адрозненні ад іншых краін, тытул ніякіх бонусаў і льгот не дае.

**Па матэрыялах «Publico» (Іспанія)**

### РАСІЯ. ПРЫХІЛЬНІКІ КАДАФІ ГАТОВЫЯ СТАЦЬ ЖЫВЫМ ШЧЫТОМ



Расійскія прыхільнікі рэжыму Кадафі апублікавалі заяву пра намер дапамагчы свайму куміру. Яны гатовыя адправіцца ў Лівію і стварыць там жывое кола вакол аўтара «Зялёнай кнігі». Такім чынам зялёнакніжнікі маюць надзею зберагчы жыццё Муамара ад злой апазіцыі. Незвычайная прапанова выклікала шмат каментараў, паколькі, як сцвярджаюць шматлікія медыя, аснову персанальнай аховы Кадафі складаюць наёмнікі-жанчыны. Акрамя таго, сам лідар лівійскай рэвалюцыі на днях заявіў, што практыку жывых шчытоў для абароны нейкіх стратэгічных аб'ектаў выкарыстоўвае менавіта апазіцыя. У любым выпадку, сітуацыя нагадвае часы вайны ў Іраку, калі Садам Хусейн спрабаваў арганізаваць жывыя шчыты для абароны мастоў і будынкаў міністэрстваў у Багдадзе ад авіяцыі NATO. Акрамя іракцаў у іх павінны былі прыймаць удзел іншаземцы. У шматлікіх краінах свету (у тым ліку ў Беларусі) на базе пасольстваў Ірака былі арганізаваныя пункты запісу ў склад ахвотных стаць шчытамі. Былі выдзеленыя каласальныя грошы на дастаўку дабравольцаў. У Іраку, аднак, хутка забыліся пра «жывыя шчыты», а выдзеленыя на тыя шчыты грошы таямніча зніклі.

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

---

ЦІКАВА

# ЧОРНЫ ВОРАН

*Алег НОВІКАЎ*



**Цяпер украінцы дзеляцца не толькі на заходніх і ўсходніх, аднак таксама і на прыхільнікаў ці праціўнікаў творчасці пісьменніка Васіля Шкляра — лаўрэата прэміі імя Тараса Шаўчэнкі. Ягоны ультранацыяналістычны раман «Чорний ворон» выклікаў буйны палітычны скандал.**

Пра раман Васіля Шкляра пачалі казаць яшчэ задоўга да таго, як яго намінавалі на атрыманне Шаўчэнкаўскай прэміі.

Васіль Шкляр — дастаткова вядомы пісьменнік, якога называюць «бацькам украінскага бестселеру». Яго самы вялікі поспех да «Чорнага ворана» — украінскамоўная версія гогалеўскага «Тараса Бульбы». Шкляраўскі Тарас Бульба выглядае заўзятым украінскім нацыяналістам. Нездарма пераклад вельмі не спадабаўся Чарнамырдзіну, які на той час быў пaслом Расіі ў Кіеве.

Аднак пры ўсім гэтым аднесці творы Шкляра да масавай літаратуры было цяжка. «Чорны воран» стаў прарывам.

Першымі твор Шкляра заўважылі і пачалі каментаваць аматары прыколаў, хаця кніга ў прынцыпе дастаткова сур'ёзная. Раман, калі хто не ведае, прысвечаны падзеям часоў Грамадзянскай вайны ў Цэнтральнай Украіне. На тэрыторыі Чаркаскай вобласці знаходзіцца вялікі лясны масіў Халодны Яр. У пачатку 1920-х тут узнік цэнтр сялянскага супраціву супраць белых і бальшавікоў. Палітычная праграма паўстанцаў была блізкая да ідэі ўкраінскіх незалежнікаў, што дазваляе разглядаць іх як ланцужок нацыянальнай вызвольнай традыцыі.

Шкляр напісаў гісторыю пра адзін з такіх атрадаў, якім кіруе атаман па мянушцы Чорны воран. Інсургенты вядуць вайну з чырвонымі, якія чамусьці ўсе як на падбор або рускія, або яўрэі (пра гэты аспект гаворка пойдзе ніжэй). Натуральна, не ўвесь змест кнігі заняты апісаннем вайсковых дзеянняў. Вялікі блок аўтар прысвяціў побыту паўстанцаў, адзін з якіх — сэксуальнае жыццё партызан, што і выклікала цікавасць публікі. Эратычная лексіка Шкляра хутка трапіла ў сеціва і адразу стала папулярнай, напрыклад: «він дивувався повнявому випуклому сраченяті».

Аднак сапраўды шырока вядомым «Чорны воран» стаў 19 лютага, калі камітэт, які вызначае лаўрэатаў Шаўчэнкаўскай прэміі, вырашыў выдаць узнагароду Шкляру. Для даведкі, Шаўчэнкаўская прэмія — самая прэстыжная літаратурная прэмія ва Украіне. У спісе яе лаўрэатаў былі такія знаныя літаратары, як драматург Аляксандр Корнейчук, паэт Зміцер Стус.

Рашэнне камітэту адразу ўскалыхнула ўсю рускамоўную грамадскасць Украіны. Яе лідары адразу пабачылі ў тэксце прамы замах на нацыянальны гонар этнічных рускіх.

У кнізе ўсе рускія выяўленыя не толькі ворагамі Украіны, аднак, у дадатак, вельмі негатыўнымі асобамі. Яны заўжды п'яныя, дурныя, палахлівыя, лаюцца на кожным кроку. Салдацкі кодэкс для чырвоных — слова незнаёмае. Забіўшы нейкага паўстанца, яны абавязкова з асалодай топчуць нябожчыка нагамі.

Як і трэба было чакаць, частка палітыкаў з Партыі рэгіёнаў адразу запатрабавала ад Януковіча прэмію Шкляру не даваць.

Каб было больш ускосных аргументаў, яны прыцягнулі мноства вайсковых спецыялістаў, літаратуразнаўцаў, якія дружна кажуць, што «Чорны воран» не вытрымлівае ніякай крытыкі ў згаданых сферах.

Напрыклад, праціўнікі Шкляра звяртаюць увагу на сцэну, калі партызан страляе па чырвоных з кулямёта і едзе пры гэтым на кані. Яны даводзяць, што такое не магчыма. Выклікаюць скепсіс раздзелы кнігі, дзе 15 партызан бяруць у палон паўсотні чырвонаармейцаў. Рэзюме зрабіла блізкая да Партыі рэгіёнаў газета «Сегодня». «Вядома, я ніколі не меў ніякіх ілюзій адносна сучаснай украінскай літаратуры. Але прэмія для Шкляра — гэта ўжо не дыягназ. Гэта прысуд. Відавочна, што гэта самы прымітыўны фікшэн, які не патрэбна чытаць культурнаму чалавеку — будзе прыняты нашай інтэлігенцыяй на ўра. Хацелася б толькі ўдакладніць, хто вызначае ў нас цяпер лаўрэатаў Шаўчэнкаўскай прэміі? Дазвольце краіне ведаць імёны герояў, якія паставілі побач імёны Шаўчэнкі і Шкляра, выдаўшы апошняму 260 тысяч народных грыўняў з нашых кішэняў», — піша адзін з яе журналістаў.

Ёсць і тыя, хто спрабуе крытыкаваць Шкляра, узяўшы дыстанцыю ад антыўкраінскага лагеру. Так, вядомы левы публіцыст Андрэй Манчук лічыць, што «Чорны воран» — гэта ўкраінская «fofudja».

«Fofudja» — тэрмін, распаўсюджаны ў «Жывым часопісе» маладымі ўкраінскімі інтэлектуаламі. Яны здзекаваліся з расійскіх нацыяналістаў, гуляючы з іхнімі міфамі пра Украіну, якая стогне пад уладаю праклятых «самостійніков».

Манчук піша: «Высмейваць дурасць расійскага нацыяналізму было смешна. Але ўсё сапсаваў той факт, што сапраўды такі кандовы ўкраінскі нацыяналізм выклікаў у гэтых жа людзей жывую сімпатыю і шчанячае захапленне. І яны сур'ёзна, з далікатным трапятаннем, паставіліся да роднай патрыятычнай «fofudja». У гэтым плане ўкраінская інтэлігенцыя яшчэ больш безнадзейная за расійскую. Не маючы ніякіх сімпатыі да рускіх лібералаў, даводзіцца прызнаць, што большасць з іх наўрад ці стала б публічна пляскаць узнагародзе, якую прысудзілі лубочнаму, прымітыўнаму, ура-патрыятычнаму раману пра барацьбу з «жыдоўскімі камісарамі». Яны пасаромеліся б. А нашы — не пасаромеліся».

У сваю чаргу, аранжавая апазіцыя стала на абарону Шкляра.

Адзін з лідараў нацыяналістычнай партыі «Свабода» пабачыў у крытыцы «Чорнага ворана» замах на саборнасць Украіны. Мемуарная літаратура ўдзельнікаў партызанскага руху ў Халодным Яры была вельмі папулярная на Заходняй Украіне ў часы паміж войнамі і спрыяла развіццю патрыятызму ў украінскай моладзі. «Толькі праслаўленне герояў рэспублікі Халодны Яр разам з папулярызацыяй Бандэры і Шухевіча давядзе для ўкраінцаў Усходу і Захаду, што мы з'яўляемся адзінай нацыяй», — кажа палітык.

Больш ліберальныя фракцыі апазіцыі, напрыклад, партыя «Бацькіўшчына», разглядае атаку на Шкляра як частку сістэмнай вайны супраць нацыянальнай інтэлігенцыі.

Практычнымі вынікамі палемікі вакол "Чорнага ворана" стала рашэнне Януковіча прэмію Шкляру не даваць. У сваю чаргу, Шкляр заявіў, што ён ад прэміі адмаўляецца на знак пратэсту супраць палітыкі міністра адукацыі і культуры Зміцера Табачніка.

У любым выпадку, канфлікт паміж пісьменнікамі і Януковічам перайшоў у новую стадыю.

СКАНДАЛ

# ПРЫГОДЫ БАРОНА ГУТЭНБЕРГА

Алег НОВІКАЎ

**Афера міністра абароны Карла Тэадора Гутэнберга, які часткова спісаў сваю доктарскую працу, здольная запусціць працэс змены ўлады ў Берліне.**



Гісторыя, на першы погляд, з катэгорыі анекдотаў пра Вовачку. Кшталту такога: «Настаўнік: «Я маю надзею, Вовачка, што не ўбачу, як ты сёння спісваеш кантрольную». Вовачка: «Я таксама на гэта маю надзею».

Толькі замест Вовачкі — арыстакрат Карл Тэадор Марыя Нікалаўс Якаб Філіп Франц Ёзэф Сільвестр Фрайхер фон унд цу Гутэнберг, міністр абароны і надзея ўсіх нямецкіх кансерватараў.

А на месцы настаўніка — нямецкая журналістыка. Менавіта яна злавіла барона на тым, што ён спісвае. 15 лютага ва ўплывовай «Suddeutschen Zeitung» з'явіўся артыкул, прысвечаны рашэнню ўніверсітэта Байройта прысудзіць міністру акадэмічную ступень доктара. Аўтар артыкула сцвярджаў, што будучы доктар займаецца плагіятам: частку працы ён папросту перапісаў у іншага аўтара.

Універсітэт арганізаваў праверку і пераканаўся, што гэта абсалютная праўда. Артыкул выклікаў такую грамадскую буру, што ўжо 1 сакавіка Карл Тэадор Гутэнберг падаў Ангеле Меркель рапарт пра адстаўку. А каб цалкам дабіць беднага Карла, пракуратура распачала супраць яго справу за падман.

Вось так за адзін дзень чалавек прайшоў шлях «з князя ў гразь». Прычым гэта не літаратурная метафара, а канстатацыя факту. Статус Карла Тэадора ў партыі сапраўды быў княжацкі. З Гутэнбергам звязвалі надзеі на будучае нямецкага кансерватызму, называючы яго не інакш як «нашым Кенэдзі». Малады барон як ніхто іншы пасаваў крытэрыям лідара.

Арыстакратычнае паходжанне, цудоўныя знешнія дадзеныя, энергія плюс кар'ерная хватка. Ужо ў 36 гадоў ён прабіўся на пасаду сакратара баварскай Хрысціянска-сацыяльнай партыі (CSU) — рэгіянальнага саюзніка хрысціянскіх дэмакратаў Меркель. CSU ўжо 60 гадоў кіруе ў Баварыі. Так што Карл Тэадор мог смела казаць, што жыццё атрымалася.

Аднак месца апаратчыка ў Мюнхене было толькі трамплінам для палітыка-юніёра. Ён атрымаў партфель міністра эканомікі ў федэральным кабінеце. Тут Карл яшчэ раз прадэманстраваў характар. Замест таго, каб вучыцца ў дарослых міністраў, адразу, што называецца, стаў у позу: пачаў шантажаваць урад адстаўкай, калі той пагодзіцца фінансаваць збанкрутаваны канцэрн Opel. У выніку Меркель дала грошы аўтамабільнай кампаніі, Гутэнберг нікуды не пайшоў, аднак яго жэст не забылі.

Хутка Карла Тэадора прызначылі самым маладым у гісторыі ФРГ міністрам абароны. Ён энергічна заняўся справай — запусціў пераход бундэсверу на кантрактны прынцып. Нічога не сведчыла пра хуткую буру. На момант, калі выбухнуў скандал, Гутэнберг быў больш папулярны за Ангелу Меркель, а палітолагі прагназавалі яму праз 5–10 гадоў крэсла канцлера. І тут такое…

Аднаму прафесару-юрысту праспічыла пачытаць працу Гутэнберга «Канстытуцыя і канстытуцыйны трактат» (кампаратыўны аналіз федэральных канстытуцый ЗША і ЕС). У тэксце міністра ён пазнаў фрагменты сваёй акадэмічнай працы, якія не былі аформленыя як цытаты. Абураны прафесар пачаў пісаць гнеўныя каментары ў інтэрнэце, пакуль іх не заўважылі пранырлівыя журналісты з «Suddeutschen Zeitung».

Магчыма, справу замялі б. Аднак промах дапусціў сам міністр. Ён пачаў выслізгваць. Спачатку ў галаву барона пастукалася ідэя называць прэтэнзіі «глупствам». Пасля нарадзілася ўвогуле фантастычная тэма пра тое, што Гутэнберг як вельмі заняты чалавек прапаваў над дысертацыяй уначы і ў цемры нешта пераблытаў.

Такая непаслядоўнасць адразу прыцягнула ўвагу прэсы. Газетчыкі пачалі капаць ў міністэрскай біяграфіі і знайшлі шмат вясёлага. Напрыклад, Карл меў у магістратуры кепскія адзнакі і па правілах не меў права пісаць доктарскую. Выключна асабістыя сувязі ў рэктараце адчынілі магістру шлях у дактарантуру.

Аднак наўрад ці гэты момант стаў прычынай адстаўкі. Як дэманструюць дадзеныя першых апытанняў у інтэрнэце, большасць немцаў спачатку гатовая была прабачыць міністру невялікі грэх. Меркель магла смела ігнараваць публікацыі.

Але журналісты не абмежаваліся мінулым міністра абароны. У фокус іх даследаванняў трапілі студэнцкія гады ўсіх сяброў ураду, уключаючы прэм'ера. Апошнім ударам стала атака з лагеру навукоўцаў і студэнцкіх асацыяцый. Яны ўспрынялі аферу Гутэнберга як удар па свайму цэху. Супраць міністра ўзняліся ўсе акадэмічныя колы.

Казус Гутэнберга мае шмат цікавых граняў. Дзесяць гадоў таму, калі федэральны ўрад фармавалі эсдэкі і Зялёныя, прэса раскапала, што Ёшка Фішэр, тагачасны дырэктар МЗС, у маладосці кідаўся камянямі ў паліцыю. Правыя газеты тады патрабавалі ад Ёшкі адстаўкі, аднак грамадства пасіўна паставілася да такой ідэі. А вось Гутэнберга выкінулі з ураду за скрадзеныя цытаты.

Акрамя таго, у выніку прыгод барона пацярпела ўся нямецкая шляхта. Калі малады барон толькі-толькі штурмаваў прыступкі ўлады, газеты ахвотна пісалі пра тое, як запатрабаваныя цяпер у палітыцы арыстакраты — людзі, якім з першага дня нараджэння даводзіць, што такое гонар, адказнасць за род, герб, край г. д. Князі, графы, бароны і іншыя ўладальнікі асабістых гербоў былі ў захапленні ад падобных публікацый. Цяпер пры згадванні імя Гутэнберга ім становіцца кепска. Прагучалі першыя заклікі да таго, каб змяніць прынцып перадачы рыцарскага тытулу. Даваць тытул за канкрэтныя паслугі, а не перадаваць яго па спадчыне.

Нарэшце, усе застылі ў чаканні палітычных наступстваў праколу Гутэнберга. Праз тыдзень адбудуцца выбары ў зямельны парламент Бадэн-Вюртэмбергу, дзе ў хрысціянскіх дэмакратаў і так справы не надта з-за таго, што яны запусцілі скандальны праект будаўніцтва новага вакзалу ў Штутгарце. А афера барона, якая цяпер ва ўсіх на вуснах, здольная канчаткова абваліць рэйтынгі партыі Меркель. І гэта за пару гадоў да федэральных выбараў. У сацыял-дэмакратаў з'явіўся ўнікальны шанец заклaсці асновы для вяртання ва ўладу.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### РУСТЭМ ХАМІТАЎ



Хамітаў прызначаны новым прэзідэнтам Башкірыі. Ён апошнім часам пасварыўся з башкірскімі нацыяналістамі, якія абвінавацілі Хамітава ў палітыцы скарачэння сферы ўжывання роднай мовы. Канфрантацыя стала яшчэ большай пасля таго, як былі арыштаваныя сябры кіраўніцтва Сусветнага курултаю башкіраў. Пачалося ўсё з таго, што напачатку лютага некаторыя сябры курултаю выказалі недавер свайму старшыні Ільгізу Султанмуратаву (ён лічыцца чалавекам Хамітава) і паднялі пытанне пра яго перавыбранне. Выбары адклалі на наступнае пасяджэнне, якое прызначылі на 26 лютага. Аднак неўзабаве пачаліся арышты сяброў выканкаму курултая, якія былі супраць Ільгіза. Іх абвінавацілі, у прыватнасці, у збіванні журналістаў, атрыманні хабару, незаконным прадпрымальніцтве, тэрарызме, экстрэмізме і нез'яўленні на допыт. Дзякуючы адсутнасці апазіцыянераў на пасяджэнні Выканкаму Султанмуратаў застаўся на сваёй пасадзе. Большасць назіральнікаў лічыць, што разборкі ў курултаі — праява вайны кланаў былога прэзідэнта Муртазы Рахімава і цяперашняга гаранта канстытуцыі. Курултай быў ідэяй Рахімава, які з дапамогай яго палохаў Маскву патэнцыйным нацыяналізмам. Між тым, Масква вельмі заклапочаная сітуацыяй ва Уфе. Хамітава ўжо выклікалі ў Крэмль.

### МАРЫНА ЛЕ ПЭН



Французскія СМІ зрабілі старшыні праварадыкальнай партыі Нацыянальны Фронт сапраўдны падарунак на 8-е сакавіка. Студыя «Tele» апублікавала вынікі грамадскага апытання: «За каго б вы прагаласавалі ў першым туры прэзідэнцкіх выбараў 2012 года, калі б выбары былі заўтра?» Тым, каго апыталі, прапанавалі выбраць сярод самых вядомых палітыкаў Францыі. Пры гэтым усе разумелі, што выбіраць па сутнасці трэба паміж цяперашнім прэзідэнтам Сарказі і кандыдатам ад сацыялістаў (пакуль барацьбу за права прадстаўляць сацыялістаў вядуць некалькі палітыкаў). Аднак вынікі даследавання аказаліся сенсацыйнымі. Лепшыя шансы выйсці ў другі тур мае Марына, якую не лічылі фаварытам. Калі б галасаванне было ў сакавіку 2010-га, яна атрымала б 23 працэнта галасоў супраць 21 ў Сарказі і Марцін Абры — старшыні партыі сацыялістаў. Тое, што агучаныя вынікі — не выпадковасць, пацвердзілі пасля яшчэ некалькі сацыялагічных агенцтваў. Цяпер усе заінтрыгаваныя: няўжо ў Марыны Ле Пэн ёсць шанец стаць прэзідэнтам Францыі? Яна сама кажа, што вельмі прыемна ўражаная вынікамі зандажу. Нават калі «Tele» трошкі памыліўся, прагрэс Марына ўражвае. Яшчэ тры месяцы таму ідэю яе прэзідэнцтва падзялялі 11–12 працэнтаў французаў.

### ЛЕХ ВАЛЕНСА



У заснавальніка руху «Салідарнасць», асобы, з прозвішчам якой звязваюць падзенне сусветнага камунізму, цяпер іншыя думкі наконт камуністычнай мадэлі. Ён публічна заклікаў да стварэння сістэмы камунізму XXI стагоддзя. Былога лідара польскай апазіцыі да такой ідэі падштурхнулі апошнія падзеі ў Афрыцы. Каб не дапусціць стварэння новых рэгіёнаў нестабільнасці, Валенса прапануе ўвесці планавыя механізмы эканомікі на сусветным узроўні. Альтэрнатыва, па словах Валенсы, вельмі не прывабная. «Усе мы апынёмся ў бездані — як бедныя, гэтак і багатыя», — сказаў Валенса. Натуральна, журналісты закідалі яго пытаннямі: чаму ж ён тады змагаўся 20 гадоў таму з сацыялістычнай Польшчай? Валенса ў адказ сказаў, што ён і яго саратнікі зрабілі памылку: «Трэба было знішчаць палітычныя структуры дыктатарскага рэжыму, аднак пакідаць планавы прынцып арганізацыі эканомікі».

▸ УСПАМІН

# МІКАЛАЙ АРЭХВА

Арсень ЛІС

**Асабіста пазнаёміўся з Мікалаем Сямёнавічам Арэхвам, бліжэй пазнаў гэтага неардынарнага чалавека ў ардынарнай дзяржсістэме я ў 1960-я гады.**



Арсень Ліс

Рыхтавалася да выдання Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Першай, пачатай у 1930-я гады, не наканавана было здзейсніцца з-за татальных рэпрэсій. Цяпер жа, у 1960-я, калі грамадскі гарызонт хоць быў і не вельмі шырокі, але яснейшы, задуманая ў асяроддзі акадэмічных вучоных-беларусазнаўцаў, яна нарэшце рэалізавалася калектывам энцыклапедыстаў пад зверхнасцю паэта-акадэміка Пятруся Броўкі. Рэалізоўваўся праект прэстыжны і перспектыўны для беларусаў. Здзейсніць яго было не так проста. Хоць вучоных ужо нібыта і нарасло, але цісну ў ідэалагічны цяжар мінулага.

У дачыненні ж да праблематыкі, гісторыі колішняй Заходняй Беларусі яшчэ заставалася глумлівая, з дазволу сказаць, канцэпцыя, згодна якой КПЗБ і легальныя дэмакратычныя беларускія арганізацыі ў масе сваёй, радавыя члены іхнія былі добрыя, нармальныя, а вось кіраўніцтва, у тым ліку БСР Грамады, Беларускага пасольскага клуба «Змаганне» ды іншых, складалася з ідэйных перараджэнцаў, чытай, «ворагаў народа», вяло не туды. Як вядома, кіраўніцтва Кампартыі Польшчы і аўтаномных у яе складзе кампартый Заходняй Беларусі (КПЗБ) і Заходняй Украіны (КПЗУ) у 1938 годзе прарэджаным рэпрэсіямі Камінтэрнам было прызнана здрадніцкім, заманена ў Маскву і неўзабаве знішчана згодна з тактыкай «приласкать и уничтожить».

У час падрыхтоўкі БелСЭ артыкулаў-персаналій пра асобных грамадска-палітычных дзеячаў, асабліва рэабілітаваных (і такіх было маса), узнікалі засцярогі. Я далучыўся да клопату энцыклапедыстаў, падрыхтаваў некалькі невялікіх матэрыялаў у фармаце энцыклапедычных артыкулаў. У тым ліку артыкульчык пра былога пасла (дэпутата) у польскі сейм ад Заходняй Беларусі, старшыню беларускай пасольскай фракцыі «Змаганне» Язэпа Гаўрыліка. У маім жаданні ўключыць у энцыклапедычны рэестр імя Гаўрыліка быў і асабісты, суб'ектыўны матыў. Да абрання дэпутатам у сойм Язэп Гаўрылік, педагог па прафесіі, настаўнічаў у нашай мясцовасці, і мой бацька ўспамінаў час ад часу яго то вершам, вывучаным ад свайго настаўніка, то словамі, якія ён сказаў, калі на вачах вучняў яго аднойчы арыштавала дэфензіва.

У рэдакцыі гісторыі БелСЭ не сказаць, што сумняваліся ў чыстаце рэабілітацыі былога дзеяча (ён прайшоў праз польскую турму, у парадку абмену палітвязнямі трапіў у СССР, праз год працы ў Наркамасветы БССР арыштаваны, у 1937-м расстраляны), але і не мелі пэўнасці, як даваць у энцыклапедыі.

Па рэкамендацыі аднаго з рэдактараў я выправіўся ў Інстытут гісторыі партыі да Мікалая Сямёнавіча Арэхвы як аўтарытэтнага ўдзельніка вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, а цяпер яго гісторыка. Цікавасць да Мікалая Сямёнавіча як аўтара ў мяне ўзнікла адразу пасля прачытання яго брашуры, прысвечанай рэвалюцыйнаму руху ў Заходняй Беларусі 1920–1930-х гадоў. У ёй нейк годна і нешматслоўна гаварылася пра складаны лёс Кампартыі Заходняй Беларусі, яе нярэдка ахвярную працу ў абставінах пераследу, падполля, упершыню за многа год з павагай згадваліся некаторыя прадстаўнікі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

У цэлым жа сцíслая публікацыя Арэхвы нанова адкрывала ў савецкай гістарыяграфіі гераічную і драматычную ў адначассі старонку палітычнай гісторыі Заходняй Беларусі. Затым пайшлі кнігі, зборнікі дакументаў і матэрыялаў, мемуарыстыка ўдзельнікаў заходнебеларускага камуністычнага падполля. Калектыў навуковых супрацоўнікаў Гістпарта, аддзел, душой якога быў Мікалай Арэхва, стварыў шырокую базу для навуковага асэнсавання аднаго з найцікавейшых перыядаў у гістарычным лёсе беларусаў.

Падчас майго першага наведвання Гістпарта я атрымаў рэкамендацыйны подпіс Мікалая Сямёнавіча на маім матэрыяле пра Гаўрыліка і першае ўражанне ад асобы Мікалая Сямёнавіча. Стрымана ўважлівы позірк вачэй, яснае шырокачолае аблічча, падцягнуты, не стары на свае гады. Спытаўся, чым займаюся. Выйшлі ў размове неяк на высвятленне маёй малой радзімы.

Найменне роднага мястэчка Мікалая Сямёнавіча можна было нярэдка пачуць у нашых ваколіцах. Яшчэ з пачатку 1920-х гадоў Рак-Міхайлоўскі адкрыў там беларускую семінарыю, і залескія хлопцы з Барунамі, да якіх напрасткі было вёрст дванаццаць, звязвалі надзею на асвету, навучанне на роднай мове.

Натуральна, падкупіла мяне і добрая літаратурная беларуская мова Мікалая Сямёнавіча, з элементамі маўлення 1920-х гадоў. На ёй ён гаварыў адразу па маім прадстаўленні. Калі я спытаўся ў суразмоўцы пра крыніцу, абставіны пазнання ім мовы, пачуў, што вывучаў ён яе ў турме, па граматыцы Тарашкевіча. Я ведаў з літаратуры, успамінаў былых палітвязняў польскіх астрогаў пра актыўную палітвучобу, самаадукацыю, арганізаваную турэмнымі камітэтамі, цяпер пачуў яшчэ сведчанне іншых прадметаў беларускай мовы.

Мой эцюдзік пра Язэпа Гаўрыліка, бласлаўлёны Арэхвам, хоць са спазненнем, у дадатак вішнёвай БелСЭ, але патрапіў.

Давялося бачыць Мікалая Сямёнавіча падчас публічнага выступлення. Аддзел культуры Фрунзенскага райкама (знайшліся там інтэлігентныя людзі) адзін час ладзіў культурніцкія імпрэзы. Збіраў навукоўцаў, літаратараў, каб адзначыць нейкую неафіцыйную дату, культурную падзею. На той раз, пра якi пойдзе размова, адзначалі 90-я ўгодкі нараджэння беларускага палітыка, асветніка, вучонага Браніслава Тарашкевіча. Была на імпрэзе і старэнькая жонка славутага беларуса. Бедная, колішняя прыгажуня, літаральна прыгнутая гадамі, саромелася сваёй старэчай паставы. Мікалай Сямёнавіч, седзячы побач, быў да яе ўважлівы і пачцівы. Выяўляў унутрана ўласцівую інтэлігентнасць у дачыненні да іншых выступоўцаў. З трыбуны расказаў пра Гданьскую канферэнцыю, на якой быў разам з Тарашкевічам... Гаварыў канкрэтна, коратка, змястоўна.

Успамінаецца яшчэ адзін выпадак маральнай падтрымкі мяне з боку Мікалая Сямёнавіча. Аднаго разу, заглянуўшы да яго на працу, застаў у кабінеце побач з ім ужо досыць вядомага беларускага гісторыка, творча актыўнага і ў меру кан'юнктурнага. Адшукаўшы ў архіве факт аб уваходжанні ў 1920–1923 гадах Тарашкевіча ў масонскую ложу «Праўда», згаданы таварыш пачаў шырока, на некалькі нумароў у «Голасе Радзімы», раскручваць масонскі сюжэт. Між тым з публікацыі не было відаць, што аўтар хоць збольшага разумее кантэкст факту масонства ў маштабе асобы Тарашкевіча, яго ролі ў вызваленчым руху, узбагачэнні беларускай духоўнасці. Захапіўся на той час эфектным эпізодам з драматычнай біяграфіі вядомага дзеяча, не даўшы сабе клопату аналітычна разабрацца ў прычынах і матывах яго ўчынкаў.



Мікалай Арэхва

Я палічыў для сябе адпаведным момантам, каб паклікаць у арбітры Мікалая Сямёнавіча, і выклаў аўтару сенсацыйнай публікацыі свае простыя прэтэнзіі. Трэба сказаць, што мой эвентуальны апанент не пярэчыў, не супраціўляўся. Тым больш, што маю, можа, занадта горача выказаную прэтэнзію, спакойна, немнагаслоўна і адназначна падтрымаў Мікалай Сямёнавіч.

Аднаго разу, ужо пасля выхаду маёй кніжыцы пра Браніслава Тарашкевіча, Мікалай Сямёнавіч сказаў: «Вам варта схадзіць да Івана Фёдаравіча Сяменікава. Ён бачыў Браніслава Тарашкевіча ў мінскай турме перад самым яго расстрэлам. Напісаць не напішаце (у той час пры рэабілітацыі рэпрэсаваных органамі ўтойвалася сапраўдная прычына смерці), але будзеце ведаць праўду... Вам трэба ведаць праўду...» Даў тэлефон Сяменікава, яго адрас. Патэлефанаваўшы загадзя, праз пару дзён я быў у доме, што ў раёне Камароўкі. Дзверы адчыніў мне высокі хударлявы срэбравалосы чалавек. Гэта і быў колішні член ЦК КПЗБ, у мінулым віцебскі рабочы, у свой час пасланы з камсамолу на падпольную працу ў Заходнюю Беларусь. Іван Фёдаравіч быў папярэджаны, хто і з чым да яго загляне, і бяседа наша пацякла натуральна, такой, на якую я і спадзяваўся.

Спачатку Іван Фёдаравіч паказаў мне публікацыі, што з'явіліся апошнім часам пра Заходнюю Беларусь, у тым ліку сваю кніжку пра падпольны друк. Галоўнае ж — распавёў пра перажытае, уласны лёс.

**Сцíслая публікацыя Арэхвы нанова адкрывала ў савецкай гістарыяграфіі гераічную і драматычную ў адначассі старонку палітычнай гісторыі Заходняй Беларусі. Затым пайшлі кнігі**

Разумна, аб'ектыўна напісанае жыццё гэтага чалавека магло б стаць красамоўным помнікам чалавечай стойкасці і трагізму ідэйнага чалавека ў таталітарным грамадстве, яшчэ адным мільённым дакументам абвінавачання сістэме, яе творцам і функцыянерам. У нас жа нават у паважнай у цэлым 6-томнай «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» знайшлося толькі некалькі радкоў, без указання нават года смерці, публікацыі і пра яго. Проста знішчаны, паўсталы да жыцця цудам і абыякава забыты неардынарны чалавек.

Пры сустрэчы, а была яна напрыканцы 1960 — пачатку 1970-х, Іван Фёдаравіч расказаў, як паўтара гады ў павільёне прыгавораных да смерці чакаў выканання вышэйшай меры пакарання, на якую такія шчодрыя і апатычна цынічныя былі прысуды двоек, троек, асобных нарад. Згадаў эпізод з допытам яго самім шэфам НКВД Берманам, вочную стаўку з былым сакратаром Гродзенскага падпольнага райкама Юзэфовічам, дарэшты зтэрарызаваным фізічна і маральна... Іван Фёдаравіч выстаяў, не падпісаў ілжэпратаколаў, як патрабавала следства, і тым самым выратаваўся ад расстрэльнага лёсу. Тарашкевічу, які пры нечаканай сустрэчы прызнаўся Сяменікаву, што ўжо падпісаў усё, што ад яго вымагалі, бо яму ўсё роўна, Іван Фёдаравіч адно паспеў крыкнуць: «Што вы нарабілі, прафесар?..» Адносна магчымасці сказаць праўду ў друку пра смерць Тарашкевіча ўмудроны жыццём Мікалай Арэхва шчасліва памыліўся.

У прадмове да твораў Браніслава Тарашкевіча, выдадзеных у перадбудовачныя гады, я ўзнавіў сцэну сустрэчы двух рэвалюцыянераў-камуністаў у савецкай мінскай турме, перад самым зыходам аднаго з іх у вечнасць. Але гэту кнігу падараваць Мікалаю Сямёнавічу, як папярэднія, ужо не паспеў.

Перадапошні раз бачыў яго на працы затурбаванага, яўна выведзенага з раўнавагі. Якраз выходзіла, мелася з дня на дзень выйсці ў свет яго кніга «Дела и люди КПЗБ: воспоминания». Тым часам у другой карэктуры было выразана цэнзурай 40 старонак тэксту, і гэту маральную абразу чалавек, вытрыманасць для якога была стылем жыцця, не мог перажыць спакойна.

Я як умеў — рэцэнзія, прызнацца, не мой жанр — адгукнуўся ў перыёдыцы на кнігу ўспамінаў старога байца заходнебеларускага камуністычнага падполля. Пры апошняй сустрэчы на развітанне ён перасказаў мне словы сваёй дачкі, выкладчыцы Мінскага інстытута замежных моваў: «Гэта лепшае, што пра цябе было калі-небудзь сказана». Фактычна ж сказана было вельмі мала ў параўнанні з перажытым і здзейсненым у жыцці гэтым сціплым і годным сынам зямлі беларускай.

ШМАТПАКУТНЫЯ КРЫЖЫ

# КРЫЖ ВІНЦЭНТУ ГАДЛЕЎСКАМУ

Таццяна УЛАСЕНКА

**Калі мы гаворым пра неверагодную колькасць страчаных у другой сусветнай вайне людзей, немагчыма не прыгадаць буйнейшы ў свеце лагер смерці, створаны ў ваколіцах Мінска ля вёскі Малы Трасцянец. Афіцыйна, гэта чацвёрты ў свеце канцэнтрацыйны лагер Трэцяга рэйху па колькасці ахвяр.**

Тут былі знішчаны яўрэі з розных гета, як з Беларусі, так і з многіх еўрапейскіх краінаў, мірныя жыхары, ваеннапалонныя. Па заканчэнні вайны нацысцкі рэжым быў асуджаны, а яго пакутнікам усталяваны мемарыяльныя знакі. Трасцянец стаў для беларускай грамадскасці сакральным помнікам ахвярам нямецкіх акупантаў. Менавіта сакральным. Бо, па іроніі лёсу, прадстаўнікамі камуністычнай улады ўжо ў найноўшыя, пасляваенныя гады было вырашана стварыць на гэтым месцы свой «помнік» — лакальны гарадскі сметнік. Агромністы абеліск бруду за некалькі дзясяткаў гадоў надзейна схаваў пад сабой сотні тысяч чалавечых костак.

Назва лагера смерці «Трасцянец» аб'ядноўвае некалькі месцаў масавага знішчэння людзей: гэта сам лагер, размешчаны побач з вёскай; урочышча Шашкоўка, дзе палілі людзей, і ўрочышча Благоўшчына, дзе масава расстрэльвалі людзей. Не ўсім вядома, што ўрочышча Благоўшчына звязана з яшчэ дзвюма трагічнымі падзеямі ў гісторыі Беларусі. Менавіта тут у 1930-я гады беларусаў знішчаў НКУС. І менавіта тут ужо нацысцкімі акупантамі быў забіты рэлігійны і грамадскі дзеяч Беларусі, арганізатар і кіраўнік Беларускага нацыянальнага антынацысцкага Супраціву ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі. Некалькі гадоў таму прадстаўнікі беларускай грамадскасці ўсталявалі на месцы забойства Гадлеўскага мемарыяльны знак — крыж Ефрасінні Полацкай, які сімвалізуе трагедыю страты не толькі




Урочышча Благоўшчына звязана з яшчэ дзвюма трагічнымі падзеямі ў гісторыі Беларусі. Менавіта тут у 1930-я гады беларусаў знішчаў НКУС. І менавіта тут ужо нацысцкімі акупантамі быў забіты ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі

выбітнага духоўнага і палітычнага павадыра Беларусі, але і ўсіх людзей, знішчаных рукамі розных акупантаў ва ўрочышчы Благоўшчына.

Падрабязна распавядаць пра Вінцэнта Гадлеўскага і яго дзейнасць мы не будзем. Пра яго напісана шмат кніжак і артыкулаў. Толькі коратка адзначым, што гэта адзін з першых рыма-каталіцкіх святароў, які праводзіў набажэнствы на роднай мове, за што цярпеў уціск з боку тады акупацыйнай польскай улады. Дасведчаны выдавец, перакладчык на родную мову «Новага запавету». Палітык, які адрадзіў беларускі нацыянальны рух і ўзначаліў беларускі антынацысцкі супраціў.

Але ж нас цікавіць праблема ўшанавання памяці. Яе і абазначым.

Мемарыялізацыя месца забойства ксяндза, а таксама яго рэабілітацыя звязаны са шматлікімі цяжкасцямі. Вядома, на пачатку 1990-х гадоў беларускі Кацёл распачаў кананізацыю каталіцкіх святароў, якія трагічна загінулі ў часы другой сусветнай вайны. Беларускае грамадства справядліва спадзявалася на тое, што належнае месца ў спісе кананізаваных зойме і ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, які аддаў сваё жыццё на служэнне Богу і Беларусі. Але гэтага не адбылося.

Што датычыцца велізарнай палітычнай і грамадскай дзейнасці, то яго імя цесна звязана з Беларускім нацыянальным антынацысцкім Супраціўам. Вінцэнт Гадлеўскі быў яго арганізатарам і кіраўніком. Праблема заключаецца ў тым, што да гэтага часу не прызнана, што падчас нямецкай акупацыі існаваў Беларускі нацыянальны антынацысцкі Супраціў. На афіцыйным узроўні кажуць пра савецкі, украінскі, польскі, толькі не пра наш, беларускі. Прызнаць гэта — значыць тлумачыць, а чым жа быў для беларусаў савецкі супраціў, савецкія партызаны. Адным перапісваннем падручнікаў па гісторыі не скончыцца. Таму ўлада і адпаведныя структуры маўчаць, нібыта нічога такога не было. Схаваная ўладамі інфармацыя па дзейнасці беларускага антынацысцкага Супраціву ўмацавала вельмі простую схему, зручную для таго, каб тлумачыць альбо замоўчваць шматлікія гістарычныя факты. А схема простая: існавалі савецкія партызаны, а ўсе, якія не савецкія, — акупанты і калабаранты.

Упершыню акцыя па ўшанаванні Вінцэнта Гадлеўскага адбылася ў снежні 2001 года. А ініцыятарам усталявання чарговага шматпакутнага памятнага крыжа праз пяць гадоў быў старшыня руху салідарнасці «Разам» Вячаслаў Сіўчык.

«Крыж меркавалася паставіць і асвяціць 24 снежня 2006 года, у чарговую гадавіну смерці Гадлеўскага, — распавядае Сіўчык. — Месца мы выбіралі разам з былым дэпутатам Вярхоўнага Савета XII склікання, на жаль, ужо нябожчыкам, Яўгенам Цумаравым. У Яўгена меліся дакументы з Берліна, дзе з нямецкай педантычнасцю было канкрэтна пазначана, у якім месцы Трасцянца кіраўніцтва СД забіла лідара Беларускага нацыянальнага антынацысцкага Супраціву. Вядома, нацызм даўно асуджаны цывілізаваным чалавецтвам, таму ні ў адной еўрапейскай краіне ў XXI стагоддзі, акрамя Беларусі, не можа быць так, каб перашкаджалі ставіць мемарыяльны знак чалавеку, які загінуў ад рук нацыстаў».

Вячаслаў Сіўчык распавёў, што ў 2006 годзе спецслужбы Беларусі запалохвалі каталіцкі касцёл, каб не адбываліся ніякія акцыі ў гонар Гадлеўскага.

«Калі мы ўсё ж дамагліся правядзення акцыі, урочышча Благоўшчына было ачэплена прадстаўнікамі сілавых структур. Тады крыж разам з ксяндзом, які павінен быў яго асвяціць, не дапусцілі ў Трасцянец. Больш двух дзясяткаў беларусаў, сярод якіх у асноўным людзі сталага ўзросту, вядомыя грамадскія дзеячы, гісторыкі, журналісты — былі затрыманыя, іх развезлі па розных міліцэйскіх пастарунках. Пасля два гады мы чакалі, каб каталіцкі касцёл паставіў крыж, але так гэтага і не дачакаліся. Таму 24 снежня 2008 года мы забралі крыж з касцёла і паставілі яго самі. Усталяваў яго намеснік старшыні руху салідарнасці «Разам» Алесь Макаеў разам з некалькімі актывістамі», — патлумачыў Сіўчык.

А Алесь Макаеў дадаў: «Мы да гэтага часу не маем магчымасці ўсталяваць ля крыжа памятную шыльду з імем Вінцэнта Гадлеўскага, бо ўпэўнены, што яна адразу будзе знішчана, як і многія іншыя памятныя знакі, усталяваныя намі ў памяць пра вядомых беларускіх дзеячаў».



Кіраўнікі БХД; у першым шэрагу — ксяндзы А. Станкевіч, Я. Германовіч, В. Гадлеўскі. У другім шэрагу — ксяндзы Леваш, С. Глякоўскі

## Біяграфічная даведка



Гадлеўскі Вінцэнт [Вікенцій Іванавіч; 16.11 (паводле іншых звестак 16.12) 1888 г., мяст. Поразава (паводле іншых звестак в. Шурычы) Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Свіслацкі р-н Гродзенскай вобл. — 24.12.1942, Трасцянец пад Мінскам], рыма-каталіцкі святар, публіцыст, перакладчык, выдавец, педагог. У 1912 годзе скончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю, у 1916-м — Мітрапалітальную духоўную акадэмію ў Петраградзе. Пасвечаны ў святары 3.6.1914. Служыў вікарыем пры катэдральным саборы ў Мінску. Удзельнік 1-га Усебеларускага з'езду 1917 года. У 1918-м уваходзіў у склад Рады БНР. Адзін з заснавальнікаў і лідараў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Рэдагаваў газету «Krynica» (Мінск, 1918). Выкладаў у Нясвіжскай беларускай семінарыі. З 1924 года — пробашч у мяст. Жодзішкі на Віленшчыне (цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл.). За актыўную нацыянальна-палітычную дзейнасць арыштоўваўся польскімі ўладамі 25.6.1925 (зняволены ў віленскай турме Лукішкі), 30.9.1925. 1.3.1926 асуджаны на 2 гады пазбаўлення волі (зняволенне заменена штрафам). Арыштаваны ў сакавіку 1927-га; асуджаны на 2 гады зняволення, якія адбыў у Макатоўскай турме ў Варшаве. З 1929 года жыў у Вільні. Адзін з заснавальнікаў Беларускага каталіцкага выдавецтва ў Вільні. Пераклаў на беларускую мову Новы Запавет (выдадзены ў Вільні, 1939). У 1936 годзе выйшаў з БХД, да верасня 1939-га выдаваў газету «Беларускі фронт», у якой выступаў як публіцыст, рыхтаваў стварэнне незалежніцкай партыі. З пачаткам другой сусветнай вайны пераехаў у Коўна, у 1940 годзе — у Варшаву, дзе арганізаваў паўлегальны «Беларускі Нацыянальны Фронт», як прыкрыццё падпольных структураў. Заснавальнік Беларускай Незалежніцкай Партыі. У чэрвені 1941 года ўвайшоў у склад створанага ў Берліне Беларускага нацыянальнага цэнтру. З верасня 1941 года жыў у Мінску. Галоўны школьны інспектар пры Генеральным камісарыяце Беларусі, сябра Галоўнай Рады Беларускай Народнай Самапомачы. Ініцыяваў стварэнне падпольнай арганізацыі «Беларускі Цэнтральны Фронт», якой кіраваў. Спрабаваў заснаваць кіруючы цэнтр Беларускага Рэзістансу. Арыштаваны СД у Мінску 24.12.1942 і ў той жа дзень расстраляны ў Трасцянцы.

Паводле энцыклапедычнага даведніка «Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі. 1794–1991» (укладальнік — Леанід Маракоў). Т. 1. Мінск, 2002, стар. 221–223.

КОНКУРС

# «АДКРЫВАЙ БЕЛАРУСЬ — АДКРЫВАЙ ЕЎРОПУ»

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**3 сакавіка прадстаўнікі дыскусійна-аналітычнай супольнасці «Ліберальны клуб» сабралі журналістаў у мінскім гатэлі «Еўропа», каб абвесціць пра старт «Show Belarus — Show Europe» — супольнай культурнай кампаніі, якая аб'ядноўвае дзеля культурнага абмену арт-колы Беларусі, Германіі, Літвы, Партугаліі, Швецыі, Эстоніі.**

У межах праекту цягам 2011 года 35 беларускіх творцаў наведаюць розныя гарады Еўропы з культурнымі акцыямі, выступамі, выставамі і іншай дэманстрацыяй таго, чым ёсць мастацтва сучаснай Беларусі — кожную групу складзе 1 музычны калектыў (або 5 музыкаў), 1 мастак і 1 фатограф. Адпаведна, у 2012 годзе 35 творцаў з розных еўрапейскіх краінаў наведаюць Беларусь са сваімі праектамі. У выніку праект ахопіць пляцоўкі 11 гарадоў: Бабруйска, Вільнюса, Валожына, Дрэздэна, Лісабона, Мінска, Нясвіжа, Пінска, Полацка, Рэчыцы, Стакгольму і Тарту. У кожным з іх пройдуць сумесныя канцэрты, выставы і майстар-класы. У 2012-м партугальцы, шведы, літоўцы, эстонцы і немцы наведаюць беларускія гарады.

Спіс беларускіх гарадоў, якія прымуць еўрапейскі фэст, пакуль не канчатковы. Адзін з арганізатараў канферэнцыі Яўген Прэйгерман прызнаўся, што дамоўленасці з мясцовымі ўладамі заяўленых гарадоў няма — праграму папярэдне ўхвалілі адно прадстаўнікі Міністэрства культуры (хоць ніхто з чыноўнікаў Мінкульту на гутарку з журналістамі так і не з'явіўся). Але паколькі гэта аддалены этап праграмы, яго пакінулі «на потым». Галоўнае — дамовіліся з Еўропай. Першы візіт беларускіх творцаў запланаваны на чэрвень гэтага года ў партугальскі гарадок Азаруджа.

Адной з мэтаў праекту, заявілі прадстаўнікі «Ліберальнага клубу», было прыцягненне ўвагі да візавай сітуацыі ў Еўропе, агітацыя за спрашчэнне візавага рэжыму паміж Беларуссю і Еўрапейскімі краінамі: «Добра, што гэты працэс пачаўся незалежна ад нас, але адначасова з нашай кампаніяй», — зазначыў Прэйгерман. І гэта яшчэ не ўсе цуды інтэграцыі, на якія здольныя арт-менеджары «там» і асабліва «тут». Прынамсі, у «Ліберальным клубе» вельмі спадзяюцца на «год прадпрымальнасці», абвешчаны сёлета беларускімі ўладамі.

Хто з творцаў будзе прадстаўляць Беларусь? Гэта яшчэ не вырашана. Падаць заяўку на ўдзел у конкурсе могуць музыкі, мастакі, фатографы і любыя іншыя творцы (апроч літаратараў). Заяўка падаецца ў адвольнай форме на беларускай, рускай або англійскай мовах.

Падрабязней аб праекце «Адкрывай Беларусь — адкрывай Еўропу» расказвае сайт кампаніі http://showbelarus.eu/

## УВАГА, КОНКУРС

Каб стаць удзельнікам праекта, адпраўце заяўку на konkurs@showeurope.by.

Заяўка павінна ўключаць:
- інфармацыю пра прэтэндэнта
- кароткі адказ на пытанне «Чаму менавіта вы падыходзіце для праекта?»
- найлепшыя ўзоры вашых твораў

Усе выдаткі, злучаныя з удзелам у праекце, пакрываюцца арганізатарамі!

Прэтэндэнтаў будзе ацэньваць міжнароднае журы, якое будуць кансультаваць незалежныя эксперты ва ўсіх трох абласцях мастацтва: музыцы, жывапісе і фатаграфіі. У склад журы ўвойдуць прадстаўнікі кожнай з шасці грамадскіх арганізацый, адказных за правядзенне праекта.

Галоўнымі крытэрамі пры адзнацы прэтэндэнтаў стануць: жаданне і здольнасці артыстаў спрыяць міжкультурнаму дыялогу, іх творчы патэнцыял і нестандартнасць творчага падыходу.

Прыём заявак на ўдзел у праекце «Адкрывай Еўропу — Адкрывай Беларусь» доўжыцца да 20 сакавіка 2011 года.

ФЕЛЬЕТОН

# ВІБРАТАРАМ ПА ШКЛЕ

Лёлік УШКІН



**Бацька адкрыў сакрэт: прэлюдыяй падзей 19-га была ягоная спрэчка з адкрытым геем, дырэктарам аднаго замежнага МЗС па праблемах «правільнага» і «няправільнага» ладу жыцця.**

Каб рэдактар галоўнага ідэалагічна вытрыманага, «чэснага» таблоіду краіны не марнаваў час і хуценька зрабіў чарговы выпуск пра чарговую змову за дзіравымі кулісамі, яму з кур'ерам былі накіраваны адпаведныя рассакрэчаныя дакументы. Вось яна, праўда! Як ёсць, так ёсць.

Штурм Дома ўраду выклікаў гнеў сярод усіх, хто вядзе правільны лад жыцця. Падаплёка гэтых падзей вядомая: замежныя клубы гомасэксуалістаў сфармавалі і прафінансавалі некаторыя структуры радыкальнай сэксуальнай арыентацыі. Сам факт існавання ў Беларусі інстытуту шлюбу М і Ж выклікае імпатэнцыю з боку некаторых знешнепалітычных сіл.

Вытрымка з канфіскаванага дакумента кампаніі «Гавары ўсё» (ГУ) аб мэтах і задачах новай стратэгіі ўзаемаадносін мужчыны і мужчыны: «Прыярытэтная задача новай стратэгіі заключаецца ў тым, каб садзейнічаць той палітычнай сіле, якая пасля выбараў гарантуе змену сэксуальнай арыентацыі ўсяго насельніцтва».

Менавіта такія мэты былі сфармуляваныя вядомым літаратуразнаўцам Фядорай. З улікам сур'ёзнасці ставак пад гэтую парнаграфічную кампанію з-за мяжы былі выдаткаваныя салідныя фінансавыя сродкі. Нездарма адзін з заходніх гомасэксуалістаў заявіў: «Беларусь — гэта месца, дзе можна з кімсьці пераспаць».

Вытрымка з канфіскаванага «Стратэгічнага плана ГУ»: «Першы этап. Стварэнне ўмоў для дэлегітымацыі нармальнай сэксуальнай арыентацыі пры дапамозе незалежнага назірання».

Нягледзячы на абмежаванасць людскіх рэсурсаў, якія падтрымліваюць нетрадыцыйную сэксуальную арыентацыю, спонсары арыентавалі арганізатараў — аплачаных гомасэксуалістаў — на правядзенне несанкцыянаванай масавай оргіі ў колькасці да ста тысяч удзельнікаў. Пры гэтым сябры Цэнтральнай Выхаваўчай Камісіі (ЦВК) правільнай арыентацыі, якія сядзелі ў Доме ўраду, былі абраныя ў якасці асноўных аб'ектаў для абвінавачвання іх у сэксуальных забабонах.

Фрагмент электроннай перапіскі па сістэме «Сэксайп» паміж Аляксандрам Белямуцкім і Барысам Муйсеевам:

— Добры дзень, Барыс.

— Слухаю.

— Просьба выступіць на плошчы ў шоў «Галубятня» з хітом «Голубая луна».

— А апаратура?

— Апаратуру даставіць Неклюсаеў на машыне.

— Супер!

19 снежня на адпаведныя заклікі сэксуальных правакатараў легкаверныя гетэрасэксуалы рушылі на Кастрычніцкую плошчу, а адтуль да Дому ўрада. І тут пачалося…

З матэрыялаў Дзяржаўнага антыгомасэксуальнага пажежнага камітэту:

«15 снежня на ўкраінскім кірунку ў пункце пропуску «Макраны»… была выяўлена група сімпатычных людзей з 5 чалавек, якія заязджалі ў РБ пад прыкрыццём паездкі да сябровак. У выніку выявілася, што ніякіх сябровак не існуе.

На польскім накірунку не былі прапушчаныя двое маладых людзей, якія мелі пры сабе мужчынскія органы з яўнай арыенціроўкай на Плошчу.

Аператыўнымі органамі памежнай службы была атрыманая інфармацыя, што група спецыялістаў па тайскаму масажу з краіны Азіяцкага рэгіёна планавала трапіць на тэрыторыю РБ і арганізаваць некалькі актаў. Дадзеная група збіралася працаваць праз этнічную групоўку ў Мінску.

На літоўскім накірунку затрыманы кур'ер, які спрабаваў правесці ў РБ сем тысяч доз віагры. Узбуджальныя сродкі павінны былі распаўсюджвацца падчас пратэстных акцый.

17 снежня не прапушчаны з Расіі мікрааўтобус з фанаткамі групы «Тату». У пасажырак знойдзены два тэлескапічныя вібратары, а таксама форменны камплект ніжняй бялізны афіцэра МУС РБ».

***

Магчыма, некаторых чытачоў шакіруюць апісаныя сцэны спробы перавароту. Хтосьці, азнаёміўшыся з рассакрэчанымі дакументамі, падціснe вусны, маўляў, што гэта за татальны кантроль над інтымам? Не спяшайцеся рабіць высновы, спадарыні і спадары!

Калі б справакаваны працэс «сэксуальнай рэвалюцыі» набраў ходу, спыніць яго было б вельмі цяжка. Таму адпаведныя дзяржаўныя органы не толькі пільна адсочвалі, хто з кім і дзе, але і змаглі на працягу сямі з паловай хвілін (як бачым, нават менш за 11 хвілін, якія не наш раманіст Паола Куэльа адводзіў на іншы акт) абараніць правільны лад жыцця.

АГЛЯД

# ГІСТОРЫЯ ПАКАЛЕННЯ І НАРОДА

Аляксей ХАДЫКА

**Нацыянальны мастацкі музей Беларусі працягвае радаваць аматараў жывапісу тэматычнымі выставамі, арганізаванымі па прынцыпу аб'яднання «прадстаўнікоў пакалення».**

Па 3 красавіка на самым выгодным месцы — адкрытай галерэі — размясціліся творы шэрагу стваральнікаў сучаснай беларускай жывапіснай школы, якія ўтвараюць тэматычную экспазіцыю «Народжаныя ў 1920-я». Сярод прадстаўленых імёнаў — Ісак Бароўскі, Уладзімір Белявусаў, Абрам Вайнштэйн, Мікалай Вальнец, Мікалай Куйчык, Павел Пагодзін, Мікалай Палянкоў, Іван Пешкур.

Гэта было першае «савецкае» пакаленне, усе яны прайшлі вайну, і адбітак радасці вялікай перамогі ўласцівы працам большасці з іх. Пераважна яны — рэпрэзентанты стылістыкі «сацыялістычнага рэалізму», увасоблены імі ў іх работах з рознымі ступенямі рамантызму ці драматызму, лірыкі ці эпікі. Як і мера таленту кожнага з прадстаўленых аўтараў — розная. Але спроба панарамнага паказу творчага жыцця цэлага пакалення дае цудоўную магчымасць акунуцца ў атмасферу даўно мінулай эпохі.

Па 17 сакавіка ў музеі экспануецца адзінае гістарычнае палатно заснавальніка сучаснай мастацкай школы Літвы Адомаса Варнаса (1879–1979) «Каранацыя Міндоўга». Гэты выключны ў якасці твор выконваўся аўтарам да 700-годдзя падзеі ўжо ў эміграцыі ў Чыкага (1951–1955) і трапіў у часы адроджанай незалежнасці Літвы ў Вільню як падарунак іншага дзеяча літоўскай эміграцыі інжынера Домаса Адамайціса. Цікава, што, надаючы акту каранацыі Міндоўга (пра месца якой не аціхаюць спрэчкі гісторыкаў — Навагрудак, Кернава, Вільня?) своеасаблівае сімвалічнае «летувіскае» гучанне, Варнас уключыў у кампазіцыю постаці дзеячаў Літвы XIX–XX стагоддзяў. Таму апрача ўкленчанай перад біскупам Кулмам у момант накладання кароны фігуры манарха на палатне можна пабачыць вобразы Антанаса Страздзяліса, Вінцаса Кудзіркі і іншых вядомых асоб пазнейшага часу.

Дарэчы, складаецца ўражанне, што для беларусаў этап стварэння падобных міфапаэтычных «гімнаў» у выяўленчым мастацтве яшчэ не скончаны. Таму варта павучыцца ў суседзяў.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 257

Падпісана да друку 11.03.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.